# УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД КАЛГАСАУ

# МАБІЛІЗУЕ СЯБЕ НА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ РАШЭНЬНЯЎ 6-га ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 82 (3986)
СЕРАДА, 25 САКАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

## Калгасны зьезд абавязвае ўсе калгасы БССР пасьледваць прыкладу калгасаў: „Новае жыцьцё“, „Полымя“ і „Чырвоны факел“

### Пакрыць недасеў азімых, пашырыць яравы клін, скарыстаць незаняты папар і бросавыя землі

*Арганізацыяй сустрэчных плянаў, разгортваньнем спаборніцтва, унядрэньнем зьдзельшчыны* ***БІЦЦА ЗА ЗАСЕЎ КОЖНАГА ЛІШНЯГА ГЭКТАРА ЗЯМЛІ***

## ДА УСІХ КАЛГАСАЎ, ДА УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ і САВЕЦКАГА САЮЗУ

*Таварышы!*

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі калгасы БССР па-бальшавіцку правялі першую веснавую сяўбу.

Гэтай перамогі мы дабіліся ў непрымірымай барацьбе з правымі і «левымі» апартуністамі — ворагамі калгаснага руху і памочнікамі кулака.

Гэтай перамогі мы дабіліся, разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і руйнуючы шалёнае супраціўленьне кулацтва.

Выкананьнем плянаў першай калгаснай вясны мы нанесьлі бязьлітасны ўдар па кулацкай праграме правых апартуністаў і контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці сацыял-інтэрвэнтаў.

**Калгасы на справе даказалі аднасобным бядняцка-серадняцкім масам усю вялізарную перавагу калектыўнай гаспадаркі над гаспадаркай індывідуальнай.**

Узброеныя балявым вопытам першай калектыўнай сяўбы, калгасы БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б дасягнулі новых гістарычных перамог у справе суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы.

Перавышана першапачатковая пяцігодка калгаснага будаўніцтва. Да канца пяцігадовага пляну суцэльная калектывізацыя СССР будзе ў асноўным закончана. Гэта ўжо беспаваротна вырашанае пытаньне. Дзесяткі тысяч новых аднасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб'ядналіся ў калектывы. Мацнеюць калгасы, народжаныя ў агні суровай клясавай барацьбы. Вырасьлі тысячы новых с.-г. арцеляй. Зруйнавана стаўка беларускай контр-рэвалюцыі — нацыянал-дэмакратаў, па кулацкі сталыпінскі хутар.

**Калгаснае селянства стала цьвёрдай і асноўнай апорай савецкай улады на вёсцы.**

**«Няма больш звароту да старога, кулацтва асуджана і будзе ліквідавана, застаецца адзін шлях — шлях калгасаў» (І. СТАЛІН).**

У адказ на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР агентурай міжнароднага капіталу — «прампартыяй», «ТКП», контр-рэвалюцыйнай арганізацыяй меншавікоў-шкоднікаў і беларускімі нацыянал-дэмакратамі — расьце і мацнее магутны сталінскі прызыў у калгасы.

**Таварышы калгасьнікі!** Мы стаім на парозе другой бальшавіцкай вясны. Веснавая сяўба надыходзіць. Гэта ўскладае на ўсіх нас вялізарныя задачы. Гэта абавязвае кожнага з нас сапраўды **па-бальшавіцку сустрэць другую бальшавіцкую вясну.**

Беспавая пасеўная кампанія трэцяга рашаючага году пяцігодкі мае найвялікшае значэньне для нашай далейшай пераможнай барацьбы за справу сацыялізму.

**Барацьба за праграму веснавой сяўбы — гэта барацьба за завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР** у бягучым годзе, гэта барацьба за новы магутны ўздым калгаснага руху і ліквідацыю кулацтва як клясы.

**Таварышы калгасьнікі, мы павінны сустрэць пасеўную кампанію ў поўнай баявой гатоўнасьці. Кожны калгас, кожны калгасьнік павінен змагацца за тое, каб плян другой бальшавіцкай вясны быў ня толькі выканан, але і перавыкан.**

**Ні адзін гэктар не павінен застацца незасеяным.** Трэці ўсебеларускі калгасны зьезд заклікае вас з падвойнай энэргіяй змагацца за кожны лішні гэктар яравых пасеваў, за колькаснае і якаснае перавыкананьне праграмы веснавой сяўбы.

У мінулую асеньнюю сяўбу многія калгасы ня выканалі поўнасьцю пасеўных плянаў. У цэлым радзе калгасаў азімы клін ня быў цалкам засеян.

**Таварышы,** хіба-ж можна дапусьціць, каб гэты ганебны прарыў быў не ліквідаваны. Трэба аддаць краіне гэты пасеўны доўг за кошт перавыкананьня праграмы другой веснавой калгаснай сяўбы.

Калгасы **«Новае жыцьцё», «Полымя»** і **«Чырвоны факел»** у рэйтарах «Зьвязьдзе» першымі ў БССР абавязаліся ліквідаваць азімы недасеў і павялічыць плошчу яравых пасеваў. **Яны далі слова перавысіць заданьні па засеве яравога кліну, пакрыць недасеў азімы, скарыстаць запушчаныя землі, выкарыстаць кожны гэктар незанятага папару і палепшыць сенажаць. Яны высунулі свае сустрэчныя пасеўныя пляны па выкананьні гэтых баявых задач.**

Таварышы калгасьнікі, усе як адзін падхопім дасканалую ініцыятыву калгасаў **«Новае жыцьцё» «Полымя» і «Чырвоны факел»! III усебеларускі зьезд калгасаў абавязвае калгасы БССР і заклікае ўсе калгасы СССР пасьледваць гэтаму бальшавіцкаму прыкладу і ўключыцца ў штурм другой калгаснай вясны.**

Кінем усе свае сілы на барацьбу за пашырэньне плошчы яравых пасеваў. Будзем біцца за кожны лішні гэктар, **арганізуем у кожным калгасе сустрэчныя пляны веснавой сяўбы.**

**Прыклад «Полымя», «Чырвонага факелу» і «Новага жыцьця» — у кожны калгас.** Не дапусьцім, каб хоць адзін гэктар зямлі пуставаў. Праз сустрэчныя пляны, праз сацыялістычнае спаборніцтва, праз баявую падрыхтоўку да сяўбы даб'ёмся максымальнага павялічэньня плошчы яравых пасеваў.

**Ні аднаго гэктара незасеянага, ні аднаго гэктара незанятага папару.**

Таварышы калгасьнікі, пакрыйце недасеў азіміны, змагайцеся за поўнае выкарыстаньне запушчаных зямель, за паляпшэньне сенажацяй, каб забясьпечыць перамогу і ў другую бальшавіцкую вясну, каб стварыць ма гутную кармавую базу!

Таварышы калгасьнікі, арганізуйце сустрэчныя пляны веснавой сяўбы, пашырайце ініцыятыву калгасаў «Чырвоны факел», «Полымя» і «Новае жыцьцё»!

Вышэй тэмпы сацыялістычнага спаборніцтва, шырэй размах ударнага руху калгасаў!

Створым брыгады ударнікаў-калгасьнікаў па правядзэньні веснавой сяўбы, арганізуем брыгады якасьці ў калгасах, **возьмем на грамадзкі буксір адстаючых.**

Барацьбой за пашырэньне яравых пасеваў, бальшавіцкай рэалізацыяй адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі, правільнай арганізацыяй працы, сапраўдным укараненьнем зьдзельшчыны, колькасным і якасным выкананьнем праграмы веснавой сяўбы арганізуем новы магутны ўздым калгаснага будаўніцтва, уцягнем новыя дзесяткі тысяч аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калектывы.

Калгасны зьезд вітае пастановы VI Усесаюзнага зьезду саветаў па пытаньнях далейшага будаўніцтва і працы калгасаў і абвяшчае сябе мабілізаваным па іх правядзеньне.

**Пад кіраўніцтвам КП(б)Б наперад за перавыкананьне гэтых баявых задач, наперад да новых баёў і перамог за справу суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыю кулацтва як клясы!**

**Мацней бязьлітасны ўдар па правых і «левых» апартуністах, якія на выгаду кулаку і шкоднікам прабуюць затармазіць пераможны калгасны рух!**

**Вышэй сьцяг сталінскага калгаснага прызыву! У бальшавіцкі штурм за праграму другой калгаснай сяўбы!**

**III УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД КАЛГАСАЎ.**

## За дзейсны крэдытны кантроль

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) падкрэсьліў значэньне поўнага выкананьня адзінага фінансавага пляну, як абавязковай і неабходнай радпасылкі для выкананьня ўсяго народна-гаспадарчага пляну, і абавязаў фінансава-крэдытную сыстэму на практыцы ажыцьцяўляць праверку выкананьня фінансавых плянаў.

Усе якасныя паказальнікі, уся вялікая праграма капітальнага будаўніцтва цесна зьвязаны з жорсткім ФІНАНСАВЫМ КАНТРОЛЕМ РУБЛЁМ.

Ажыцьцяўленьне гэтай задачы, паводле крэдытнай рэформы, даручана Дзяржбанку, крэдытнай сыстэме, якая зьяўляецца сваяасаблівай нэрвовай сыстэмай народнай гаспадаркі, магутным вагаром мабілізацыі і пераразьмеркаваньня сродкаў.

Апошняя пастанова СНК, якая ўносіць рад зьмен у крэдытную рэформу, адзначае, што банкаўска-крэдытная сыстэма направільна зразумела задачы і фунцыі праверкі выкананьня народна-гаспадарчых плянаў рублём, узяла на сябе зусім непасільныя і неўласьцівыя крэдытным органам задачы плянаваньня і рэгуляваньня УСІХ ГАСПАДАРЧЫХ ПРАЦЭСАЎ, заблытапася ў тэхніцы ковай работы.

Аўтаматычны крэдыт «пад плян» засланіў сабою асноўную задачу крэдыту — кантроль за выкананьнем пляну, за ходам накапленьня ў ограмаджаным сэктары.

Скажэньні крэдытнай рэформы, яе няправільнае разуменьне аблягчылі шкоднідкую дзейнасьць сацыял-інтэрвэнтам — Шэрам, Бэрлацкім, якія імкнуліся дэзарганізаваць работу крэдытнай сыстэмы.

З-за недахопаў у правядзеньні крэдытнай рэформы прамысловасьць СССР перабрала ў Дзяржбанку больш 1 млрд. руб.

Нездавальняючая работа крэдытных органаў, аўтаматызм крэдыту бяз уліку рэальных дасягненьняў былі шырока скарыстаны тымі гаспадарчымі арганізацыямі, якія ня здолелі справіцца з мабілізацыяй сродкаў, якія апартуністычна недаацэньвалі значэньня гаспадарчага разрахунку ў рабоце прадпрыемстваў.

Навошта клапаціцца аб эканоміі, аб рацыяналізацыі, аб гаспадарчым разрахунку, калі крэдытныя органы не адмаўляюць у крэдытах, калі ліміты зьяўляюцца мяшком, які можна расьцягваць без канца, калі Дзяржбанк пакрывае прарывы. Гэта прывяло да ігнараваньня барацьбы за якасныя і колькасныя паказальнікі, да прарываў у прамфінплянах.

Апартуністычная недаацэнка крэдытнай рэформы, скажэньні ў рабоце банкаў падвялі глебу пад «тэорыі» аб адміраньні грошай на даным этапе, аб тым, што ўкараненьне плянавых пачаткаў выцісквае фінэнсавую сыстэму, аб ліквідацыі гаспадарчага разрахунку, які здаецца ў архіў. Гэтыя «левыя» заскокі, гэтыя разважаньні зьяўляюцца на справе самай шкоднай апартуністычнай балбатнёй.

ЗАЎЧАСНАЕ ПАХАВАНЬНЕ ФІНАНСАЎ ГЭТА ПЕРАСКОК ПРАЗ ГІСТАРЫЧНЫ ЭТАП, ГЭТА НЕРАЗУМЕНЬНЕ СВАЯАСАБЛІВАСЬЦІ АПОШНЯГА ЭТАПУ НЭП'У.

Ва ўмовах завяршэньня фундаманту сацыялістычнай эканомікі роля плянавых пачаткаў няўхільна ўзрастае, аднак, гэта зусім ня значыць, што гаспадарчы разрахунак ліквідуецца. Мы перайшлі ад першапачатковай стадыі НЭП'у да яго апошняй стадыі, аднак, у нас застаюцца гандаль, грашовая сыстэма і гаспадарчы разрахунак, як АСНОЎНЫ МЭТАД гаспадараньня. Фінансавая сыстэма на працягу некаторага гістарычнага пэрыяду зьяўляецца і будзе зьяўляцца магутным вагаром гаспадарчага жыцьця. ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК — аснова работы прамысловых прадпрыемстваў.

«Без ажыцьцяўленьня прынцыпаў гаспадарчага разрахунку на практыцы ад заводу да гаспадарчага аб'яднаньня, без таго, каб на справе прымусіць падлічваць рублі і капейкі, непьга навесьці патрэбны парадак у прамысловасьці і ва ўсёй гаспадарчай рабоце. Рост плянаваньня ў народнай гаспадарцы ня зьнімае з парадку дня прынцыпаў гаспадарчага разрахунку» (Молатаў).

У пачатку сьнежня 1929 г. у сваёй пастанове аб рэарганізацыі прамысловасьці ЦК УсеКП(б) адзначыў, што пераход на гаспадарчы разрахунак павінен быць ПРАВЕДЗЕН У САМЫ КАРОТКІ ТЭРМІН, ВА ЎСІХ БЕЗ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯ ПРАДПРЫЕМСТВАХ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Партыя патрабавала правядзеньня прынцыпаў гаспадарчага разрахунку ВА ЎСЁЙ РАБОЦЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ і гэта цалкам адпавядае і цяперашняй, апошняй стадыі НЭП'у.

Трэба адзначыць, што дырэктывы ЦК НЕ ЗНАЙШЛІ ЯШЧЭ НАЛЕЖНАГА ПРАЛАМЛЕНЬНЯ ў рабоце многіх нашых гаспадарчых арганізацый.

Мы маем выпадкі апартуністычнага скажэньня асноўных прынцыпаў гаспадарчага разрахунку, аслабленьня барацьбы за ЯКАСЬЦЬ прадукцыі, за якасныя і колькасныя паказальнікі пляну, ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ НАКАПЛЕНЬНЕ.

Матар'ял, які мы сёньня зьмяшчаем, ілюструе, як дрэнна некаторыя гаспадарчыя арганізацыі праводзяць гаспадарчы разрахунак, змагаюцца за прамфінплян. БЕЛШКЛААБ'ЯДНАНЬНЕ замест зьніжэньня сабекошту на 8 проц., павысіла яго за ўдарны квартал на 5 проц., ліміт перавыдатканы на 40 тыс. руб.

Звышпляновая запазычанасьць БЕЛШВЭЙАБ'ЯДНАНЬНЯ перавышае паўтара мільёна руб. Гарбарня «БАЛЬШАВІК» зьнізіла сабекошт замест 2 проц. на 0,5 (за люты), перавысіўшы ліміты на 11 тыс., выдаўшы са зваротных сродкаў на капітальнае будаўніцтва 6 тыс. руб. ЛЕСБЕЛ ужо ў пачатку сакавіка поўнасьцю скарыстаў увесь свой квартальны ліміт. На складах раду ВІЦЕБСКІХ фабрык валяюцца запасы нерэалізаванай прадукцыі і непатрэбных матар'ялаў на дзесяткі тыс. руб.

Яшчэ не ва ўсіх прадпрыемствах ажыцьцяўляецца гаспадарчы разрахунак, нават такі гігант, як Бабруйскі камбінат, ня вызваленны яшчэ ад апекі Лесбелу.

СПАЖЫВ�ЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ дрэнная працай па мабілізацыі сродкаў і рэалізацыі тавараў зрывае фінансавыя пляны.

«За кожны процант зьніжэньня сабекошту мы павінны змагацца з ўсёй большай актыўнасьцю» (Молатаў). Гэту дырэктыву часта забываюць многія нашы работнікі.

Ад агульнага крэдытаваньня плянаў — да крэдытаваньня паасобных зьдзелак! Гэта мера наносіць руйнуючы ўдар па сабезаўшчыне, расхлябанасьці і адсутнасьці фінансавай дысцыпліны.

Новыя зьмены ў крэдытнай рэформе зьяўляюцца зброяй барацьбы за фінплян, за бесьперабойнае фінансаваньне сацыялістычнай рэканструкцыі.

У гэтым вялікае народна-гаспадарчае і палітычнае значэньне пастановы СНК аб перабудове работы Дзяржбанку.

Крэдытная рэформа — на службу сацыялістычнай гаспадарцы, на службу бальшавіцкім тэмпам!

Жорсткая эканомія, фінансавая дысцыпліна, энэргічная мабілізацыя сродкаў — абавязак усіх нашых гаспадарчых арганізацый.

Пакончыць з поглядамі на крэдыт, як на бяздонны дзяржаўны кашалёк, сыстэматычна і пляхава праводзіць САПРАЎДНЫ КАНТРОЛЬ РУБЛЁМ, ФІНАНСАВЫМІ САНКЦЫЯМІ ЎЗЬДЗЕЙНІЧАЦЬ НА ЗРЫЎШЧЫКАЎ ПЛЯНАЎ, вчысьціць нізавую крэдытную сетку ад чужых, кулацкіх і кандрацьцеўска-садырынскіх элемэнтаў — бліжэйшыя і важнейшыя задачы крэдытнай сыстэмы.

Партыйныя арганізацыі павінны неаслабна кіраваць барацьбой за поўнае выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў пляну.

## З пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

*20 сакавіка 1931 году* *№ 229* *Масква, Крэмль*

### аб зьменах у сыстэме крэдытаваньня, умацаваньні крэдытнай работы і забесьпячэньні гаспадарчага разьліку ва ўсіх гаспадарчых органах

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва і плянавай сацыялістычнай арганізацыі гаспадаркі, рашучае выцісканьне капіталістычных і звужэньне сфэры дзейнасьці прыватна-гаспадарчых элемэнтаў у савецкай эканоміцы зрабілі магчымым і неабходным пераход ад камэрцыйнага (вэксальнага) крэдытаваньня да простага банкаўскага крэдытаваньня ўсёй народнай гаспадаркі, якое ажыцьцяўляецца праз Дзяржаўны банк.

#### I. АБ СКАЖЭНЬНЯХ У ПРАВЯДЗЕНЬНІ КРЭДЫТНАЙ РЭФОРМЫ

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР устанаўляе, што ў практыцы правядзеньня крэдытнай рэформы ў выніку незадавальняючага кіраўніцтва, у прыватнасьці эўсім незадавальняючай падрыхтоўкі да яе правядзеньня, з аднаго боку, і простага шкодніцтва — з другога, дапушчаны грубейшыя скажэньні асноўных задач, пастаўленых перад крэдытнай рэформай.

Буйнейшымі недахопамі ў правядзеньні крэдытнай рэформы Савет Народных Камісараў Саюзу ССР лічыць:

а) устанаўленьне простага агульнага крэдытаваньня пад плян, замест адзінага правільнай сыстэмы крэдытаваньня паасобных гаспадарчых зьдзелак прадпрыемстваў і арганізацый, што прывяло да так званага аўтаматызму крэдытаваньня, які выключае магчымасьць кантролю з боку банкаў і гаспадарчых органаў за ходам выкананьня пляну;

б) неправядзеньне ў жыцьцё прынцыпу даговараных адносін паміж прадпрыемствамі і аб'яднаньнямі (пастаўшчыкамі і пакупцамі), што прывяло да аслабленьня кантролю спажыўца над пастаўшчыкамі ў пытаньнях якасьці і асартымэнту прадукцыі, тэрмінаў пастаўкі, умоў разьліку і інш.;

в) парушэньне гаспадарчага разрахунку ў прадпрыемствах і аб'яднаньнях, што побач з абезасабленьнем іх прыбыткаў і зваротных сродкаў прывяло да аслабленьня зацікаўленасьці гаспадарчых органаў у фінансавых разультатах сваёй дзейнасьці (зьніжэньне сабекошту, накапленьне прыбыткаў і інш.);

г) тэхнічная непадрыхтаванасьць Дзяржаўнага банку да асваеньня новай сыстэмы, крайняя і навыкліканая неабходнасьцю складанасьць тэхнікі разьліку, што не дало магчымасьці Дзяржаўнаму банку забясьпечыць сапраўдны кантроль рублём за ходам вытворства і звароту.

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР лічыць неабходным ліквідаваць у найкарацейшы тэрмін гэтыя скажэньні ў практыцы правядзеньня крэдытнай рэформы і правесьці ў жыцьцё папраўкі ў крэдытнай сыстэме, прадугледжаныя пастановай Савету Народных Камісараў ад 14 студзеня 1931 году. У рэзультаце правядзеньня гэтай пастановы Савету Народных Камісараў ССР павінна быць забясьпечана сапраўднае ўмацаваньне прынцыпу гаспадарчага разрахунку, як асноўнага мэтаду кіраўніцтва прадпрыемствамі і аб'яднаньнямі ажыцьцяўляючага сэктару, і стварэньне сапраўднай зацікаўленасьці і адказнасьці кожнага прадпрыемства і кожнай арганізацыі за выкананьне пляну, правядзеньне рацыяналізацыі вытворчасьці, зьніжэньне сабекошту, накапленьне прыбыткаў.

#### II. АБ РОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА БАНКУ

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР канстатуе, што аднэй з прычын нездавальняючага правядзеньня крэдытнай рэформы зьяўлялася няправільнае разуменьне Дзяржаўным банкам сваіх задач, якое знайшло сваё выражэньне ў імкненьні банку прысвоіць сабе непасільныя функцыі плянаваньня і рэгуляваньня дзяржаўных працэсаў, што не магло ня прывесьці да падрыву адказнасьці гаспадарчых наркаматаў і гаспадарчых арганізацый.

На самай справе роля Дзяржаўнага банку ў справе разьвіцьця сацыялістычнай гаспадаркі заключаецца ў тым, каб:

а) стаць разьліковай арганізацыяй для аграмаджанай гаспадаркі, агульна-дзяржаўным апаратам уліку вытворства і размеркаваньня прадуктаў;

б) забясьпечыць сапраўдны штодзённы кантроль рублём за ходам выкананьня пляну вытворства і звароту тавараў, за выкананьнем фінансавых плянаў і ходам накапленьняў у аграмаджаным сэктары народнай гаспадаркі;

в) забясьпечыць умацаваньне гаспадарчага разрахунку прадпрыемстваў і гаспадарчых аб'яднаньняў, як асноўнага вагара ў выкананьні пляну (колькасных і якасных заданьняў) ва ўсім аграмаджаным сэктары.

#### III. АБ МЕРАХ, ЯКІЯ ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЬ ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК У АРГАНІЗАЦЫЯХ АГРАМАДЖАНАГА СЭКТАРУ І АБ УМАЦАВАНЬНІ КРЭДЫТНАЙ РАБОТЫ

У мэтах умацаваньня гаспадарчага разрахунку і практычнага ажыцьцяўленьня сапраўднага фінансавага кантролю за ходам выкананьня пляну вытворства і звароту тавараў і накапленьняў у аграмаджаным сэктары Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляе:

1. Дзяржаўныя, гаспадарчыя і кааперацыйныя органы і прадпрыемствы ў межах плянавых заданьняў устанаўляюць свае ўзаемаадносіны па дастаўках тавараў, вытворстве работ і аказаньні паслуг шляхам заключэньня дагавароў і дачы заказаў і нясуць за іх выкананьне законам устаноўленую адказнасьць.

2. Крэдытныя ліміты ўстанаўляюцца дзяржаўнымі органамі ў адпаведнасьці з пастановай Савету Народных Камісараў Саюзу ССР ад 14 студзеня 1931 г., п. п. 5-9. У межах гэтых лімітаў Дзяржаўны банк адкрывае крэдыты адпаведным прадпрыемствам і арганізацыям у разьмерах, што выцякаюць са складзеных прадпрыемствамі і гаспадарчымі органамі дагавароў, і выконвае даручэньні гаспадарчых органаў у межах адкрытых крэдытаў па меры фактычнага выкананьня дагавароў.

3. Форма разрахункаў гаспадарчых органаў па таварных зьдзелках павінна быць указана ў складзеных дагаварох, у залежнасьці ад чаго Дзяржаўны банк выконвае іх даручэньні ў парадку акцэпту, акрэдытыву ці асобнага рахунку, прычым акцэпт у даных умовах лічыцца пераважнай формай разрахунку.

4. Крэдытаваньне сэзонных патрэб гаспадарчых органаў у зваротных сродках, зьвязанае з авансаваньнем працэсу вытворства, павінна адбывацца ў мэтавым парадку і на поўныя тэрміны з забясьпячэньнем тэрміновасьці пагашэньня крэдытаў спэцыяльнымі абавязацельствамі, што выдаюцца называльнікамі Дзяржаўнага банку. Гэтыя абавязацельствы гарантуюцца фактычнымі выпускам прадукцыі.

5. Крэдытаваньне загатоўчых арганізацый робіцца Дзяржаўным банкам у мэтавым парадку і выключна ў межах фактычнага накапленьня загатоўленай прадукцыі.

6. Ня гледзячы на тое, што гаспадарчыя арганізацыі зьяўляюцца ў сваёй большасьці дзяржаўнымі арганізацыямі, страты іх ні ў якім разе ня могуць пакрывацца за лік сродкаў Дзяржаўнага банку.

7. Усе гаспадарчыя органы і кааперацыйныя арганізацыі абавязаны складаць і публікаваць ва ўстаноўленыя законам тэрміны справаздачныя балянсы аб іх дзейнасьці.

Абавязаць ведамствы накладаць дысцыплінарныя спагнаньні на кіраўнікоў прадпрыемстваў і работнікаў уліку за несвоячасовае складаньне і апублікаваньне балянсаў. Прапанаваць Дзяржаўнаму банку прымаць меры крэдытнага ўзьдзеяньня, якія-б забясьпечвалі своячасовае апублікаваньне і падачу Дзяржаўнаму банку балянсаў ва ўстаноўленыя законам тэрміны.

8. Усе спрэчкі, якія ўзьнікаюць паміж гаспадарчымі органамі па заключаных дагаварох і зьвязаны з матар'яльнай адказнасьцю аднаго з іх перад другім, вырашаюцца органамі дзяржаўнага арбітражу.

Палажэньне аб дзяржаўным арбітражы распрацаваць Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі ў 10-дзённы тэрмін і ўнесьці на зацьвярджэньне Савету Працы і Абароны.

9. Пры невыкананьні гаспадарчымі органамі іх абавязацельстваў перад Дзяржаўным банкам, апошні павінен ужываць наступныя меры крэдытнага ўзьдзеяньня:

а) абмежаваньне або поўнае спыненьне выдач з кантракарэнту гаспадарчага органу;

б) продаж у прымусовым парадку тавараў або матар'яльных каштоўнасьцяй, належачых гаспадарчаму органу.

Азначаныя меры ўзьдзеяньня ўжываюцца пасьля папярэджаньня гаспадарчага органу.

10. Пры акцэптнай форме разрахунку прыняць наступны парадак накіраваньня грузаў і іх аплаты:

а) груз накіроўваецца непасрэдна ў адрас пакупніка;

б) выдача грузаў праводзіцца толькі па пацьвярджэньні Дзяржаўным банкам аб яго аплаце;

в) у выпадку неаплаты грузу тавар прадаецца Дзяржаўным банкам з тым, каб магчымая страта была пакрыта стараной, якая парушыла дагавор.

11. У зьмену пункту 17-га пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ССР ад 14-га студзеня 1931 году тэрмін увядзеньня ў дзеяньне новай практыкі крэдытаваньня на падставе гэтай пастановы ўстанавіць з 1-га мая 1931 году. Да гэтага тэрміну абавязаць усе гаспадарчыя органы (прамысловасьць, транспарт, кааперацыя і інш.) скончыць заключэньне дагавароў.

**Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР**
**В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).**
**Кіраўнік справамі Савету Народных Камісараў Саюзу ССР**
**Л. КЕРЖАНЦАЎ.**

## Там, дзе пануюць голад і рабства

### ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА У БАЎГАРЫІ

ВЕНА. Як паведамляюць з Сафіі, па ўсёй Баўгарыі шырока ўжываецца так званая «працоўная павіннасьць», якая зьяўляецца нічым іншым, **як самай бесчалавечнай прымусовай працай.** На працягу 8 дзён кожны год усе грамадзяне, якія дасягнулі 19-цігадовага ўзросту, адбываюць гэту павіннасьць. Рабочы дзень цягнецца 16-18 гадзін. Жыўнасьць выключна дрэнная якасьці. Для пабудовы дзяржаўных шосаў і чыгунак кожны год на працягу 5 дзён прызываюцца ўсе мужчыны ад 21 да 40 гол. Апрача таго ёсьць яшчэ і абшчынная працоўная павіннасьць, якая цягнецца 10 дзён на працягу году.

Існуюць яшчэ «чарговая» працоўная павіннасьць, «надзвычайная» працоўная павіннасьць і праца зьвяновелых. Абавязаныя да працоўнай павіннасьці носяць назву «працавіц». Існуе нават спэцыяльнае кіраўніцтва працоўнай павіннасьцю. Ужываньне прымусовай працы з кожным годам павялічваецца.

Згодна пялаўна апублікаваных даных кіраўніцтва працоўнай павіннасьці за час з 1 красавіка 1929 году па 31 сакавіка 1930 году на розных прадпрыемствах было занята **23.190 «працавіц».** Яны за гэты час выканалі работы на **суму 280 млн. леў** (адна лева — 1,4 кап.). Кіраўніцтва працоўнай павіннасьці атрымала ад выкарыстаньня прымусовай працы **чыстага прыбытку 182.277 тыс. леў супроць 145 млн леў у 1928-29 годзе.**

«Працавіцы» эксплёатуюцца, галоўным чынам, на пабудовах дарог, пашы, асушкі балот і г. д. У 1928-29 годзе каля 6-7 тыс. чалавек працавала таксама на розных прадпрыемствах: на цагельнях, абутковых майстэрнях і г. д. У бягучым годзе, як паведамляе ўрадавая «Рэч», міністэрствам будуць патрэбны **25 тыс. «працавіц».**

(ТАСС).

## Прызнаньне швэдзкіх лесапрамысловцаў

СТАКГОЛЬМ, 19. Саюз швэдзкіх лесаўласьнікаў зьвярнуўся ў швэдзкі парлямант з лістом, у якім далучаецца да ўжо раней унесенага у парлямант праекту аб прыняцьці мер супроць лясного імпарту з СССР.

У гэтым лісьце лесаўласьнікі ўказваюць, што савецкі лясны імпарт выціснуў швэдзкі лес з некаторых рынкаў і **што кампанія супроць савецкага песу, якая вядзецца ў радзе краін пад пёзунгам «пратэсту» супроць «прымусовай працы», якую ўжываюць нібы ў СССР, надзвычай выгодна для швэдзкай лясной прамысловасьці.** «Таму, — гаворыцца ў лісьце, — вельмі важна, каб з боку Швэцыі не прадпрымалася нічога такога, што магло-б пропідзейнічаць развіцьцю памянёнага пратэсту ў краінах, якія ўвозяць лес».

Такім чынам, лесаўласьнікі адкрыта прызнаюць, што паклёпніцкая кампанія, якая праводзіцца пад лёзунгам барацьбы супроць выдуманай «прымусовай працы» ў СССР, **зьяўляецца нічым іншым, як сродкам, пры дапамозе якога працьюць выціснуць СССР з сусьветнага лясного рынку.**

## Нявольніцтва ў Заходняй і Паўночнай Афрыцы

ЛЁНДАН. Лібэральны штотыднёвік «Нэйшэн» публікуе артыкул аб нявольніцкай працы ў Зах. і Паўн. Афрыцы. Аўтар артыкулу ўказвае, што тубыльцы Зах. Афрыкі працуюць у якасьці нявольнікаў, абслугоўваючы ангельскія параходныя кампаніі. Паводле слоў артыкулу, гэтыя тубыльцы за жабракую плату працуюць 10 гадзін у дзень, а часамі — калі параходы знаходзяцца ў порце — іх прымушаюць працаваць на працягу ўсёй ночы. Аўтар указвае таксама, што ў Паўночнай Афрыцы ўсім адкрыта праводзіцца гандаль нявольнікамі.

## Склад савецкай дэлегацыі канфэрэнцыі на другой сусьветнай па збожжы

МАСКВА. 26 сакавіка гэтага году ў Рыме адкрываецца падрыхтоўчая канфэрэнцыя да другой сусьветнай канфэрэнцыі па збожжы. На парадку дня канфэрэнцыі стаяць наступныя пытаньні: 1) міжнародная арганізацыя с.-г. вытворчасьці; 2) міжнародная арганізацыя с.-г. крэдыту; 3) арганізацыя міжнароднага гандлю збожжам.

Для ўдзелу ў работах канфэрэнцыі **ад Савецкага Саюзу выехала ў Рым дэлегацыя ў складзе намесьніка старшыні Дзяржпляну СССР — тав. Крыцмана,** члена Калегіі Наркамзьнешгандлю — **тав. Кіселя** і віцэ-прэзыдэнта Акадэміі с.-г. навук імя Леніна — **прафэсара Тулейкава.**

## Салдаты нанкінцаў ня хочуць ваяваць супроць рэвалюцыйных войск

### 44-я НАНКІНСКАЯ ДЫВІЗІЯ ПЕРАЙШЛА НА БОК ЧЫРВОНЫХ

**БЭЙПІН, 24. Як паведамляе японскае агенцтва Сімбун-Рэнго Чырвоная армія ўзмацніла сваю актыўнасьць у раёне Бэйпін-Ханькоўскай чыгункі, дзе звыш 30 тыс. чырвоных войск ПАГРАЖАЮЦЬ ХАНЬКОУ. Паміж нанкінскімі генэраламі ўзмацніліся спрэчкі на фінансавай глебе. Агенцтва заяўляе, што правал кампаніі супроць чырвоных тлумачыцца НЕЖАДАНЬНЕМ САЛДАТ ВАЯВАЦЬ СУПРОЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ВОЙСК. БОЛЬШАСЬЦЬ САЛДАТ 44-й ДЫВІЗІІ НАНКІНСКІХ ВОЙСК ПЕРАЙШЛА НА БОК РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ВОЙСК. У РАЁНЕ УШЭН-ГУАНА, У ПАЎНОЧНАЙ ЧАСТЦЫ ХУБЭЯ, УСТАНОЎЛЕНА САВЕЦКАЯ УЛАДА.**

### Першая чырвоная армія ў правінцыі Хубэй

ШАНХАЙ, 23. З пачатку сакавіка раён паўднёвага ўсходу правінцыі Хэнань, па граніцы з правінцыяй Аньхуэй і да Бэйпін-Ханькоўскай чыгункі на захад, а таксама частка поўначы правінцыі Хубэй ахоплены магутным селянскім рухам. Акрамя шматлікіх партызанскіх атрадаў створана першая **Чырвоная армія гэтага раёну.** Многія часьці нанкінскіх войск перайшлі на бок чырвонай армії.

Ханькоўская ўлада вельмі занепакоена разьвіцьцём селянскага руху, які ня толькі захоплівае паасобныя паветы, вёскі і гарады, але ўсё больш і больш набліжаецца да чыгункі, парушаючы чыгуначныя зносіны, руйнуючы масты, захапляючы рухомы склад і матар'ялы і прыцягваючы на свой бок кадры чыгуначнікаў.

Аб сур'ёзных размерах руху сьведчыць факт пасылкі супроць чырвонай арміі ня менш 50 тыс. войск і эскадрыльлі ў складзе 6 бомбамётаў. Некаторыя вайсковыя часьці, прызначаныя для адпраўкі ў Цьзянсі, тэрмінова пасланы на задушэньне селянскага руху на паўднёвым усходзе Хэнані. Колькасьць нанкінскіх войск, якія перайшлі на бок чырвоных, — вялікая. Сярод нанкінскіх войск нагадваецца вялікая дэмаралізацыя.

У Ханькоу надзвычай напружанае становішча. Улада ўзмацніле тэрор, спадзяючыся гэтым запярэдзіць паўстаньне. У горад прыбываюць новыя трупы бежанцаў з заможных колаў сельскіх мясцовасьцяй і невялікіх гарадоў.

(ТАСС).

## Забясьпечыць Данбас рабочай сіл

*ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА*

# Агонь па ўсялякіх спробах апартуністаў скажаць і рэвізаваць марксыцка-ленінскую тэорыю

**„Толькі ў барацьбе з буржуазнымі забабонамі ў тэорыі можна дабіцца ўмацавання пазыцый марксызму-ленінізму“ (СТАЛІН)**

## *Работу Камвузу на вышэйшую ступень!*

На Камуністычны універсітэт БССР ускладзены вялікія і адказныя задачы па падрыхтоўцы кіруючых кадраў нізавых і сярэдніх звеньняў КП(б)Б. У выкананьне гэтых задач Камвуз, як вышэйшая ў БССР партыйная навучальная ўстанова, адыгрывае надзвычай важную ролю, год ад году набываючы новыя посьпехі ў сваёй рабоце.

За апошнія гады значна павялічылася колькасьць студэнтаў і паленшыўся іх сацыяльны склад. Калі ў 1926 годзе ў Камвузе вучылася толькі 169 асоб, дык у гэтым годзе іх колькасьць павялічылася да 494 чалавек. Сярод прынятых у гэтым годзе ў Камвуз студэнтаў — 64,5 проц. рабочых па сацыяльным становішчы, замест 39 гэтай катэгорыі прыёму 1926-27 году.

Побач з гэтым пры Камвузе створан рад навучальных арганізацый, як-то: вячэрні сэктар з аховам 600 чалавек, курсавы сэктар партактыву — 200 чалавек, курсы ЛКСМ на 50 чалавек, кароткатэрміновыя курсы — 50 чал. і заочны сэктар з кантынгентам у 900 чалавек. Разгортваньне Камвузам такой вялікай работы значна павышае яго ролю ў выкананьні задач партыі па падрыхтоўцы кіруючых бальшавіцкіх кадраў.

Партыйны калектыў Камвуву за апошнія гады вырас, ідэалёгічна ўзмацніўся, павысіў бальшавіцкую бандольнасьць у бязьлітаснай барацьбе на два фронты — за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, у барацьбе з ухілам ад ленінскай лініі ў пацыятаньні.

Разам з тым, як гэта сыгналізавала ў свой час «Правда» і выдушена камісіяй ЦК КП(б)Б і Культпропу ЦК УсеКП(б) па абсьледваньні Камвузу, у рабоце парткалектыву і кіраўніцтва КУБ дапушчан рад палітычных памылак і прарываў. Кіраўніцтва Камвузу ня здолела справіцца належным чынам з задачамі сучаснага пэрыяду. У навучальнай і палітычна-выхаваўчай рабоце Камвузу ня было досыць рашучага і свяўчасовага змаганьня з ухілам ад марксыцка-ленінскай рэвалюцыйнай тэорыі. Мешчаніцкі ідэалізм рубінчыкаў у эканоміцы, тэорыі механістаў у радзе галін навукі, дэборынчына ў філёзофіі і прыродазнаўстве ня былі свяўчасова падпарадкаваны крытыцы.

Таксама адным з буйнейшых недахопаў у рабоце Камвузу зьяўляецца адсутнасьць да апошняга часу распрацоўкі і вывучэньня пытаньняў рэвалюцыйнай барацьбы і работы камуністычных партый у Зах. Беларусі і Польшчы. У выкладаньні гісторыі Беларусі праводзілася ідэалізацыя наўстаньня 1863 году, ідэалізавалася БСГ і яе праграмы, як... марксыцкай. У выкладаньні беларускай літаратуры няма марксыцкага сьветапогляду, не забясьпечваецца палітычна-клясавы аналіз непралетарскіх пісьменьнікаў, ня выкрыты клясава-варожыя ўстаноўкі ў мовазнаўстве Лёсіка і інш. нацдэмаўскіх элемэнтаў.

У выніку неўдалага падбору навучальных падручнікаў, слабой работы катэдраў і зусім незадавальнага кіраўніцтва іх работай з боку вучэбнай часткі дапускаліся скажэньні марксыцка-ленінскага асьвятленьня шматлікіх пытаньняў на радзе дысцыплін. Такое становішча сьведчыць, што кіраўніцтва парткалектыву не праявіла ў даных пытаньнях бальшавіцкай пільнасьці, невыстарчальна мабілізавала партыйныя масы на барацьбу на ідэалёгічным фронце.

Побач з рашучым рэагаваньнем на праявы правага апартуністаў, вылазкі ў Камвузе вялікадзяржаўнага шавінізму, беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавініямаў іншых колераў, партыйны калектыў ня досыць цьвёрда ставіў пытаньне аб беларусізацыі. Недвацэнка гатаўна пытаньня з боку часткі студэнтаў і выкладчыкаў, фармальныя адносіны, часамі маскаванае супраціўленьне беларусізацыі, што па сутнасьці зьяўлялася правым вялікадзяржаўнага шавінізму, на працягу доўгага часу не сустракала рашучага адпору з боку партыйнай арганізацыі Камвузу. Адна ячэйка прымірэнча адносілася да выступленьня Мядзьведзева, які вылез з праграмай поглядаў вялікадзяржаўнага шавінізму. Ячэйка не дала палітычнай ацэнкі гэтай вылазцы агента клясавага ворага, а змазала пытаньне. Толькі бюро парткалектыву выправіла палітычную памылку гэтай ячэйкі. З другога боку— мы мелі пасобныя факты невыстарчальнай пільнасьці і актыўнасьці ў выкрыцьці варожых нацдэмаўскіх элемэнтаў (справа Чаржынскага і Бабарэкі).

Такія буйнейшыя палітычныя прарывы і апартуністычныя памылкі дапушчаны ў значнай меры таму, што бальшавіцкая самакрытыка, як важнейшая зброя ў барацьбе са скажэньнямі партыйнай лініі, не зьяўлялася штодзённым мэтадам работы ў Камвузе. Па фактыгрубага заціску самакрытыкі парткалектыў рэагаваў на досыць рашуча і свяўчасова. На большасьць заметак крытычнага зьместу, якія друкуюцца ў камвузаўскай сьтэнце «Ленінец», бюро парткалектыву не рэагавала. Нават абвідзена маўчаньнем высунутае газэтай абвінавачваньне бюро парткалектыву ў апартунізьме і хвасьцізьме за непрапрацоўку ў Камвузе верасьнёўскай адозвы ЦК УсеКП(б). Такім чынам, кіраўніцтва парткалектыву ня спрыяла разгортваньню самакрытыкі, часамі заставалася глухім да сыгналаў аб наяўнасьці фактаў апартуністычнага скажэньня партыйнай лініі ў рабоце Камвузу.

Абмеркаваўшы становішча Камвузу, бюро ЦК КП(б)Б вызначыла рад канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на ўзмацненьне кіруючага складу КУБ і ліквідацыю выяўленых камісіяй прарываў. Адбыліся перамбары кіруючага органу партарганізацыі. Замест раней існаваўшага бюро парткалектыву выбран парткамітэт у складзе 21 члена і 5 кандыдатаў.

Вывады камісіі і пастанова бюро ЦК аб рабоце Камвузу шырока абмеркаваны на сходах парткалектыву. Партыйная арганізацыя Камвузу мабілізуецца на штурм прарываў, на бальшавіцкае выкананьне ўсіх задач, якія пастаўлены перад Камвузам Цэнтральным Камітэтам партыі.

Ів.

# Усе сілы навуковых работнікаў

## на тэарытычную распрацоўку праблем сацыялістычнага будаўніцтва і клясавага змаганьня пралетарыяту

**(Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 15 сакавіка 1931 г. па дакладу прэзыдыуму Кам. акадэміі)**

Этап завяршэньня фундаменту сацыялістычнай эканомікі патрабуе перабудовы ўсёй навукова-дасьледчай работы, падначаленьня ня строгай плянавасьці, стварэньня шматлікавых кадраў навуковых работнікаў-камуністаў і ў асаблівасьці перамаганьня, адзначанага тав. Сталіным, адставаньне навуковай работы ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва.

Абастраньне клясавага змаганьня знайшло ў апошнія гады сваё яркае адлюстраваньне і на тэарытычным фронце. Буржуазны ўплыў выліўся ў форму раду антымарксыцкіх і рэвізіяніцкіх тэорый: меншавіцкі ідэалізм рубінчыны ў эканоміцы, мэханістычныя тэорыі ў філёзофіі, палітэканоміі і іншых галінах, меншавіствуючы ідэалізм групы Дэборына ў філёзофіі і прыродазнаўстве, перавярэўшчына у літаратуразнаўстве.

Неабходна яшчэ бязупынная работа па выкараненьні існуючых і ўзнікаючых у розных навуковых галінах тэорый, адбіваючых буржуазны і сацыялдэмакратычны ўплыў.

Увага і сілы навуковых работнікаў павінны быць згуртаваны на ТЭАРЫТЫЧНАЙ РАСПРАЦОЎЦЫ ПРАБЛЕМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА І КЛЯСАВАГА ЗМАГАНЬНЯ ПРАЛЕТАРЫЯТУ. Выходзячы з ленінскага прынцыпу партыйнасьці навуковай работы і непрымірымай барацьбы з варожымі тэорыямі, навуковыя работнікі-камуністы павінны, разам з тым, даваць адпор спрашчэнству ў тэарытычных дыскусіях, падмене іх скапястычнымі словаспрэчкамі.

Камакадэмія праводзіла правільную палітычную лінію, рашуча змагаючыся з усімі ўхіламі ад лініі партыі і дасягнула на гэтай падставе раду значных посьпехаў у сваёй рабоце. Камакадэміяй была разгорнута барацьба з буржуазнымі і сацыял-дэмакратычнымі тэорыямі і напрамкамі ў розных галінах навуковых ведаў.

Рад тэарытычных праблем у галіне гісторыі, права і дзяржавы, па сусьветнай гасподарцы і інш. былі глыбока распрацаваны. Разгорнута работа па падрыхтоўцы навуковых кадраў.

Аднак, за апошні час Камакадэмія спазнілася з перабудовай сваёй работы ў адпаведнасьці з гэтай правільнай лініяй (асабліва па эканамічным і аграрным інстытутах), з прычыны чаго не ажыцьцявіла выстарчальнага і свяўчасовага кіраўніцтва ў адносінах раду тэарытычных дыскусій і распрацоўцы раду новых тэарытычных праблем.

ЦК УсеКП(б) пастанаўляе:

1. Прапанаваць прэзыдыуму Камакадэміі перабудаваць работу сваіх установу такім чынам, каб была забясьпечана яшчэ больш цесная сувязь навуковай работы з актуальнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва і клясавага змаганьня пралетарыяту і хутчэйшая ліквідацыя адстаўленьня навуковай думкі ад практычнай работы партыі.

У сваёй навукова-дасьледчай рабоце Камакадэмія павінна выходзіць з неабходнасьці на першы плян высунуць распрацоўку канкрэтных вузлавых праблем, зьвязаных з бягучымі задачамі партыі і пралетарыяту, з уступленьнем у перыяд сацыялізму і з задачай выкананьня пяцігодкі за чатыры гады на аснове рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, з задачамі культурнай рэвалюцыі і, у цэлым, з клясавым змаганьнем сусьветнага пралетарыяту на даным этапе.

Пры гэтым Камакадэмія павінна ўзяць на сябе праву сапраўдкай тэарытычнай дапамогі партыйным, савецкім гаспадарчым і інш. арганізацыям у іх практычнай рабоце.

Абавязаць нарканаты, сумесна з Камакадэміяй, у месячны тэрмін разгледзець у адпаведных частках пляны Камакадэміі з пункту гледжаньня таго, наколькі ў іх адбіта задача тэарытычнай распрацоўкі вузлавых актуальных пытаньняў у данай галіне сацыялістычнага будаўніцтва.

Камакадэмія, яе інстытуты, навуковыя т-вы павінны прымаць пастаянны сыстэматычны ўдзел у мерапрыемствах навуковага характару, якія арганізуюцца нарканатамі, гаспадарчымі органамі і кіруючымі органамі грамадскасьці, як: экспэдыцыях, абсьледваньнях, навуковых зьездах, нарадах і г. д.

2. Прэзыдыум Камакадэміі павінен забясьпечыць сапраўднае кіраўніцтва тэарытычнай работай, згуртоўваючы сваю ўвагу на разгледзе важнейшых тэарытычных праблем па сутнасьці і правяраючы з гэтага пункту гледжаньня работу ўсіх сваіх інстытутаў і таварыстваў.

Для вядзеньня бягучай апэрацыйнай работы і разгрузкі прэзыдыуму Камакадэміі ад раду арганізацыйных і адміністрацыйна-гаспадарчых пытаньняў выпучыць пры прэзыдыуме Камакадэміі сакратарыят.

3. Практыкаваць у інстытутах Камакадэміі пераважна сыстэму калектыўнай распрацоўкі праблем і заданьняў з уключэньнем мэтадаў ударных брыгад і сацыялістычнага спаборніцтва з тым, каб былі забясьпечаны ў кожным выпадку рэальныя результаты работы, яе канкрэтны і практычны эфэкт, а таксама сапраўды бавыя тэмпы ў выкананьні плянаў Камакадэміі і ў навуковай рабоце наогул.

Адным з важнейшых мэтадаў уцягненьня партыйных кадраў у работу Камакадэміі павінна зьяўляцца мабілізацыя адпаведных таварышоў пры ЦК з асьпаленьнем іх на 2-3 месяцы ад іншых абавязкаў для распрацоўкі найбольш актуальных праблем сацыялістычнага будаўніцтва, што стаяць у пляне Камакадэміі.

Неабходна прыцягваць да сумеснай з Камакадэміяй работы зацікаўленыя нарканаты і ўстановы на дагаворных пачатках.

4. Устанавіць больш выразнае разьмежаваньне задач і зьместу работы інстытутаў і навуковых таварыстваў, усталяўшы на апошнія арганізацыю масавай работы, справу прапаганды марксызму і ленінізму ў сваёй галіне, папулярызацыю навуковых дасягненьняў і работу з навуковымі кадрамі, асабліва ў нацрэспубліках і аддаленых абласьцях.

5. Правесьці праверку наяўнага складу навуковых супрацоўнікаў Камакадэміі і забясьпечыць рашучае вылучэньне маладых сіл з ліку правяўшых сябе і вытрыманых камуністаў. Забясьпечыць за Камакадэміяй для навуковай і настаўніцкай работы ня менш 10 проц. эсьпірантаў, якія канчаюць яе інстытуты і інстытуты ІЧП адпаведных спэцыяльнасьцяй. Рашуча пакончыць з сыстэмай сумяшчальнасьці работнікаў Камакадэміі, якая прыводзіць у радзе выпадкаў да зрыву працоўнай дысцыпліны і поўнай бездапаможнасьці.

6. Аб'яднаць ІЧП з інстытутамі Камакадэміі такім чынам, каб вучэбная работа асьпірантаў была арганізавана ў асноўным на базе навучальных апаратаў ІЧП. Даручыць культпрэзідыуму ЦК УсеКП(б), сумесна з прэзыдыумам Камакадэміі і дырэктарамі ІЧП, распрацаваць канкрэтны план аб'яднаньня з тым, каб правесьці яго да 1 пілёня гэтага году. Забясьпечыць пры гэтым выразнае арганізацыйнае разьмежаваньне ў рамках Камакадэміі навукова-дасьледчай і навучальнай работы пры цэсным увязцы падрыхтоўкі асьпірантаў з навукова-дасьледчай работай.

7. Прапанаваць прэзыдыуму Камакадэміі асабліву ўвагу зьвярнуць на актуалізацыю і палітычнае завастраньне ўсёй работы асацыяцыі прыродазнаўства, пасярэньне і пашырэньне падрыхтоўкі прыродазнаўча-навуковых кадраў і ліквідацыі выпадковага і нескончанага карантану сеткі ня навуковых установ; арганізаваць сэкцыі хэміі і фізыкі. Даручыць Камакадэміі прыступіць да разгортваньня, на аснове існуючай сэкцыі, Інстытуту тэхнікі і тэхнічнай палітыкі.

8. Адной з асноўных і важнейшых задач Камакадэміі павінна быць ажыцьцяўленьне мэтадалёгічнага кантролю над работай найбольш важных ведамственых, навукова-дасьледчых інстытутаў і установаў СССР, якія абавязаны па патрабаваньні Камакадэміі прадстаўляць плян сваёй навукова-дасьледчай работы.

Камакадэмія павінна на справе ўзяцца за ўскладзеную на яе ЦК УсеКП(б) задачу плянаваньня і праверкі работы ўсіх марксыцка-ленінскіх навуковых установаў і арганізацый.

Асабістая ўвага павінна аддавацца на ўсёй рабоце Камакадэміі дапамозе пастаноўцы навукова-дасьледчай справы на месцах, у нац. рэспубліках, у абласьцях і раёнах і кіраўніцтву мясцовымі аддаленьнямі Камакадэміі.

9. Усклясьці на Камакадэмію задачу сыстэматычнага павышэньня кваліфікацыі партыйных навуковых кадраў шляхам завочнай іх перападрыхтоўкі, скліканьня спэцыяльных курсаў, навуковых канфэрэнцый па важнейшых праблемах і інш.

10. Лічыць матар'яльную базу Камакадэміі зусім невыстарчальнай для выкананьня задач, якія перад ёй пастаўлены.

Прапанаваць прэзыдыуму ЦВК узмацніць матар'яльную базу Камакадэміі па лініі капітальнага будаўніцтва (асабліва ў сувязі з уваходжаньнем у Камакадэмію Інстытуту Чырвонай прафэсуры), штатнага складу, падвышэньня зарплаты і спэцыяльных сродкаў для навуковых работ і навуковых камандыровак як у СССР, так і заграніцу. Праз месяц увайсьці ў ЦК са справаздачай аб выкананьні гэтай пастановы.

# Супроць нацыянал-дэмакратычнай буржуазнай канцэпцыі ў пытаньнях права і дзяржавы

**(Па матар'ялах камісіі па абсьледваньні і чыстцы апарату БАН)**

Клясавае змаганьне на ідэалёгічным фронце ў БССР асабліва яркі адбілася ў працах БАН. Пасобныя зьвены БАН былі выкарыстаны беларускай контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўшчынай у барацьбе супроць камуністычнай партыі, супроць дыктатуры пралетарыяту. Нацыянал-дэмакратычная атмасфэра, якая панавала ня ўсю час у БАН, прасочвалася і ў работу катэдры савецкага будаўніцтва і права.

Мінулым працы катэдры—гэта абгрунтаваньне нацыянал-дэмакратычнай канцэпцыі, абгрунтаваньне прынцыпаўшчыны, клясавага прымірэньня ў пытаньнях разуменьня дзяржавы і права.

Пры абмеркаваньні праекту закона «Аснову зямляўпарадкаваньня і зямлякарыстаньня» акадэмік Грэдынгер гаварыў: «Думаю, што перш за ўсё у нашым праекце на першым месцы стаіць двор, а не зямельная абшчына, таму, што зямельная абшчына ў нас ня можа адыгрываць той ролі, як у РСФСР. Але даромна ўгледжваць у гэтым некаторы ўхіленьні да пачаткаў індывідуалістычнасьці. Наадварот, двор, як такавы, ёсьць поўная калектывістычная фігура, якая прадстаўляе сабою юрыдычную асобу». Тут каментары непатрэбны, ясная буржуазная ўстаноўка, абгрунтаваньне ў завуаляванай форме капіталістычнага развіцьця сельскай гаспадаркі. Інакш кваліфікаваць гэта выступленьне нельга. За такую «валіфікацыю гаворыць самы сэнс прыведзенай цытаты.

А вось выступленьне другога работніка катэдры Мароза. Ён казка: «Дзяржава дасьць крэдыты і зямлю толькі таму, хто зробіцца сапраўдным гаспадаром. Але гэта не азначае, што кожнаму дадуць зямлю, а калі ён гультай, дзяржава можа і ня даць яму зямлі». Вось як «навукова» абгрунтоўвалася кулацкая прынцыпаўшчына, сутнасьць якой заключалася у насаджэньні хутороў, у капіталістычным разьвіцьці сельскай гаспадаркі.

Паройдзем да зборніка прац катэдры. У гэтым зборніку яркі адбіта нацыянал-дэмакратычная канцэпцыя ў пытаньнях права і дзяржавы. У першым артыкуле «Ідэя беларускай дзяржаўнасьці перад стварэньнем савецкай Беларусі» яго аўтар Парэчын пад маскай крытыкі нацыянал-дэмакратызму пабудаваў нацыянал-дэмакратычную тэорыю стварэньня БССР. Парэчын ідэалізуе шляхэцкага рэвалюцыянэра Кастуся Каліноўскага. Ён піша: «Галоўнаю мэтай тых паўстанцаў па Беларусі, якімі кіраваў Кастусь Каліноўскі, было вызваленьне беларускага працоўнага народу ад сацыяльнага ўціску». Такім чынам, аўтар разглядае Каліноўскага не як шляхціча, буржуазнага рэвалюцыянэра, а як барацьбіта за вызваленьне працоўнага народу ад сацыяльнага ўціску. Парэчын у сваім артыкуле выказвае такую думку: «На цьвёрды палітычны шлях беларускі нацыянальны рух стаў тады, калі беларускія рэвалюцыйныя сілы аб'ядналіся ў палітычныя партыі з поўнымі сацыяльна-палітычнымі праграмамі». Выходзіць па Парэчыну, што не Кастрычніцкая рэвалюцыя паклала аснову і дала магчымасьць розьвіцьця БССР, а беларуская сацыялістычная грамада, «шапаніўскі» перыяд і т. д. Аўтар далей гаворыць аб тым, што праграма БСГ зьяўляецца значным крокам у разьвіцьці ідэі беларускай дзяржаўнасьці. Аб якой дзяржаўнасьці ідэе гутарка,—аўтар ні слова не гаворыць. Ён абыходзіць моўчкі тое, што БСГ была буржуазнай партыяй і, зразумела, ідэя дзяржаўнасьці ў яе праграме была буржуазнай ідэяй. Ён не сказаў таксама і аб тым, як вырашалася нацыянальнае пытаньне ў праграме і пастановах РСДРП(б), у праграме і пастановах УсеКП(б). Установка Парэчына ў гэтых адносінах амаль нічым не адрозьніваецца ад установкі нацыянал-фашыста Лупкевіча. Лёкай дзёнавы, лёкай пана Пілсудзкага—Лупкевіч таксама кажа ў сваёй працы «25 год дзейнасьці БСГ» аб тым, што каб ня было ў праграме БСГ пунктаў аб незалежнасьці Беларусі, дык ня было б і сучасной БССР. Такім чынам, установка Парэчына зьяўляецца нацыянал-дэмакратычнай у поўным сэнсе гэтага слова, з якой трэба весьці бязьлітасную барацьбу.

Характарызуючы перыяд нямецкай акупацыі Беларусі, Парэчын зьяўляе: «У гэты час у Беларусі стварэцца рад беларускіх арганізацый. Сярод іх для нас найбольшую цікавасьць мае група, якая выдавала газэту «Гоман». У гэтай газэце прыцавалі... браты Антон і Ян Луцкевічы і Бацілаў Пастэўскі. Гэта група абараняла ідэю незалежнасьці былога «вялікага княства Літоўскага». Падкрэсьлівы момант ідэі незалежнасьці, аўтар ні слова не гаворыць аб клясавым твары гэтых «незалежнікаў», контр-рэвалюцыянэраў фашыстаў. Між тым, мы добра ведаем, што сабою прадстаўляюць гэтыя «незалежнікі». Яны ўсімі мерамі, усімі спосабамі імкнуліся і імкнуцца ператварыць Савецкую Беларусь у калёнію Заходня-Эўрапейскага імпэрыялізму і у чэрнцую чарту фашыцкай Польшчы.

У вывадах аб абвінчэньні нацыянал-дэмакратаў буржуазна-дэмакратычная рэспубліка Парэчын гаворыць: «Буржуазна-дэмакратычным элемэнтам удалося абвясьціць буржуазна-дэмакратычную рэспубліку толькі таму, што органы савецкай улады на Беларусі не насьпелі своечасова ўзяць у сваё рукі кіраўніцтва беларускім нацыянальным рухам. Кіраўнікі беларускага руху сустрэлі гэта і патрабавалі ад савецкага ўраду перадаць ім кіраўніцтва ўсім дзяржаўным жыцьцём Беларусі».

Як бачыце, паводле разважаньняў Парэчына, абвінчэньне буржуазнай рэспублікі нацыянал-дэмакратамі камуністамі ня ў іх клясавай варожасьці да Кастрычніцкай рэвалюцыі, не ва ўзброеным змаганьні супроць дыктатуры пралетарыяту, а ў «несвяўчасовасьці кіраўніцтва беларускім нацыянальным рухам» з боку органаў савецкай улады. Калі распыфраваць гэту думку Парэчына на належным чынам, дык мы убачым, што ён імкнецца давесьці нібы органы савецкай улады ў часе абвінчэньня нацыянал-дэмакратамі буржуазнай рэспублікі былі супроць нацыянальнага руху.

«Беларусь мела усе падставы, патрэбны для таго, каб ёй быць пейкай цэлай адзінкіраўнай адзінкай, гэта ўсьвядомілі сабе ўсе палітычныя партыі і арганізацыі на тэрыторыі Беларусі, але амаль кожная з іх мела свой погляд на практычнае вырашэньне гэтага пытаньня, непадобны да праекту ў гэтым пытаньні іншых партый і гэта было асноўнай перашкодай на шляху арганізацыі краю», так разважае Парэчын аб перыядзе паміж лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі. Вышэйпаданым Парэчын хоча сказаць, што, каб ня было супярэчнасьцяй паміж партыямі на нацыянальным пытаньні, дык апошняе была б вырашана для Беларусі ў далатнім сэнсе і пры буржуазным часовым ураде. Вось да чаго дагаварыўся Парэчын, «навукова» абгрунтоўваючы ідэю «беларускай дзяржаўнасьці».

Наогул артыкул Парэчына прасякнут з пачатку да канца нацыянал-дэмакратычнай канцэпцыяй. У Парэчына цэлая сыстэма нацыянал-дэмакратычных буржуазных поглядаў у разуменьні дзяржавы і права.

У гэтым-жа зборніку прац катэдры С. Слупскі ў артыкуле «Аспэўныя моманты разьвіцьця і склад сучаснай клясовасьці ў ВССР» абліў кулацкую ідэалёгію. Аўтар не падаляе сялянства на тры катэгорыі—беднота, середняцтва і кулацтва. Ён іх называе «гаспадарамі сельскай гаспадаркі». Узяўшы сялянства, як адну сацыяльную катэгорыю, Слупскі праводзіць такую думку, што беднаку і середняку ня дораг інтарэс Кастрычніцкай рэвалюцыі, гэта ён хоча давесьці абгрунтаваньнем росту значнасьцяў з боку «гаспадароў сельскай гаспадаркі». Аўтар ня хоча бачыць клясавай барацьбы, барацьбы кулака супроць савецкай улады, супроць дыктатуры пралетарыяту.

Далей Слупскі імкнецца давесьці, што «кожны склад службовых асоб і ступень матар'яльнай забясьпечанасьці іх у сувязі са становішчам эканомікі, а таксама і некаторай часткі і бытавыя асаблівасьці жыцьця краіны» даюць падстаў у дна службовых алачынстваў. Наводзе разважаньняў аўтара выходзіць, што службовыя алачынствы робіць ня толькі шкодзік, контр-рэвалюцыянэр, пралезны ў апарат, а нават вылучэнцы. Слупскі пішэ падзелу служачых у гаіцыяльных адносінах на робіць, а разглядае іх, як аднародную масу.

Артыкул акадэміка Грэдынгера «Наша права на спадчыну, якой пажадана яе мець» таксама прасякнут насквозь буржуазна-юрыдычнай мэтадалёгіяй. Аўтар ня даў марксыцкага аналізу нашага права на спадчыну і ня вызначыў тых шляхоў, на якіх павінна яно ісьці далей у сваім разьвіцьці пры шпаркім росьце сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі. Грэдынгер пэрыяд ваеннага камунізму трактуе, як «плян—у адну хвіліну пабудаваць сацыялізм». Такая трактоўка знаходзіцца ў поўнай супярэчнасьці партыйным устаноўкам ацэнкі ваеннага камунізму. Гэта трактоўка нічога агульнага ня мае з ацэнкай ваеннага «камунізму, данай у праграме Камінтэрну.

У артыкуле Батацы «Прынцыпы рэвізіяніцызму ў касцыйным працэсе на грамадзянскім працэсуальным кодэксе БССР» праводзіцца відавочная буржуазная ўстаноўка адносна нашай сыстэмы суда. Да пытаньня асьвятленьня суда па грамадзянскіх справах Батацы падыходзіць, як буржуазны вучоны без клясавага аналізу.

У зборніку зьмешчаны і артыкул былога віцэ-губернатара, а потым прыгнэтаўца Вішнеўскага. Гэты ідэолёг экспляататарскіх клясаў стараніа абгрунтоўваў кулацкую палітыку Прышчэпава — кугарызьму.

Нельга абыйсьці моўчкі і артыкул макроваага рэакцыянэра—праф. Шыраева «Крымінальны кодэкс БССР». У гэтым артыкуле ўстанаўлівае толькі пасобныя супярэчнасьці, якія ён бачыць у нашым крымінальным кодэксе. Ён ніводнага слова не сказаў аб клясавым характары крымінальнага кодэксу, аб тым, што крымінальнае заканадаўства ў СССР зьяўляецца першым заканадаўствам у сьвеце, якое служыць прыладай у руках пралетарыяту для падаўленьня клясавых ворагаў, у адрозьненьне ад буржуазных краін, дзе крымінальнае права зьяўляецца прыладай для падаўленьня пралетарыяту і працоўнага сялянства.

Такім чынам, катэдра права БАН фактычна выконвала сацыяльны заказ нашых клясавых ворагаў. Катэдра праведзвала, «навукова» абгрунтоўвала кулацкую прынцыпаўшчыну, яна падводзіла «навуковую» базу пад контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм, яна праводзіла буржуазныя ўстаноўкі ў пытаньнях разуменьня права і дзяржавы.

Зараз катэдра сучаснага права разгалівавала ў катэдру савецкага будаўніцтва і права. Катэдра разгарнула крытыку дапушчаных палітычных памылак і варожых установак, якія мелі месца ў мінулых яе працах. Катэдра павінна да канца выкрыць і выкарчаваць усё шкоднае для нашага сацыялістычнага будаўніцтва і сваёй далейшай работай апраўдаць назву катэдры савецкага будаўніцтва і права.

М. Мацюкавіч.

# Спыніць практыку крэдытаваньня „пад плян“

## Ліквідаваць апартуністычныя безадказныя адносіны да дзяржаўных сродкаў

## *ПРЫМУСІЦЬ УСЕ АРГАНІЗАЦЫІ ЗМАГАЦЦА ЗА ФІНПЛЯН*

**Жорсткі гаспадарчы разрахунак, цьвёрдая эканомія, моцная фінансавая дысцыпліна—асновы крэдытнай рэформы**

## СПАЖЫВЕЦКУЮ КААПЭРАЦЫЮ— НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР!

### Правядзем дзесяцідзеньнік ліквідацыі прарываў у мабілізацыі сродкаў па каапэрацыйнай сыстэме

Вялікія задачы, пастаўленыя партыяй і ўрадам перад спажывецкай каапэрацыяй: максымальнае разгортваньне прыгарадных гаспадарак, хлебазаводаў, фабрык-кухань, гандлёвай сеткі, складаў—патрабуюць шырокай мабілізацыі ўсіх сродкаў для капітальнага будаўніцтва.

Таму максымальная мабілізацыя сродкаў насельніцтва, шляхам пашырэньня, укладаў, авансаў, мэтавых узносаў зьяўляецца важнейшай задачай спажывецкай каапэрацыі.

Нежаданьне па-бальшавіцку змагацца за выкананьне і перавыкананьне плану збору сродкаў, недаацэнка ролі каапэрацыі ў гэтай справе зьяўляецца адным з віраў апартунізму на практыцы.

Спажывецкая каапэрацыя БССР вельмі адстае ў галіне мабілізацыі сродкаў. Квартальны плян збору паёў і авансаў выкананы менш, чым на 50 проц.

У выніку ганебна дрэнная работы пастаўлена пад загрозу праграма фінансаваньня капітальнага будаўніцтва.

Рабочыя маскоўскага заводу «АМО», улічваючы вялізарнае значэньне мабілізацыі сродкаў, высунулі прапанову абязьсьціць дзесяцідзеньнік ліквідацыі прарываў па мабілізацыі сродкаў спажывецкай каапэрацыі. Дзесяцідзеньнік павінен прайсьці пад лёзунгам: «Спажывецкая каапэрацыя, якая перабудоўваецца на новых рэйках, павінна мець цьвёрдую фінансавую базу».

Рэдакцыя «Зьвязды» цалкам падтрымлівае прапанову амаўцаў.

Партыйныя і грамадзкія арганізацыі павінны дапамагчы каапэрацыі ажыцьцявіць адно з яе важнейшых абавязацельстваў — плян мабілізацыі сродкаў.

Спажывецкую каапэрацыю БССР, у адносінах збору паёў і ўкладаў, трэба ўзяць на грамадзкі буксір.

Дзесяцідзеньнік ліквідацыі прарываў павінен даць пералом у галіне мабілізацыі сродкаў.

## Праверыць прадпрыемствы рублём

### Парушэньні фінансавай дысцыпліны, па-заплянавыя выдаткі і безадказнасьць

«Без суровага выкананьня фінансавага пляну немагчыма ажыцьцяўленьне вызначанага народнага-гаспадарчага пляну».

Як выконваюць прадпрыемствы і гаспадарчыя аб'яднаньні БССР гэту настанову сьнежанскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), як праводзяць яны фінансавы рэжым, аб захаваньні якога ёсьць рад пастаноў ураду?

Вынікі выкананьня фінпляну за два месяцы першага кварталу кажуць аб парушэньні радам прадпрыемстваў фінансава-крэдытнай дысцыпліны, аб перавышэньні лімітаў, аб па-заплянавых выдатках і г. д.

### ШТО ХАВАЕЦЦА ЗА „АБ'ЕКТЫЎНЫМІ ПРЫЧЫНАМІ“

Шкловаб'яднаньне павінна было ў асобным квартале зьнізіць сабекошт прадукцыі на 6 проц., сабекошт павысіўся на 5 проц. Гэта прывяло да павышэньня лімітаў на 40.000 руб. Зразумела, некаторую ролю адыгралі тут так'зюнктурныя затрудненьні з сыр'цом, перабоі ў забесьпячэньні заводаў. Але галоўная прычына — няўменьне кіраўніцтва спаборніцтвам і ўдарніцтвам, слабае правядзеньне гаспадарчага разрахунку, дрэнная работа па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Значна перавысіла ліміт і Белшэйаб'яднаньне. Прычыны — дрэнная мабілізацыя рэсурсаў, залежы гатовай прадукцыі, зьвышлянавыя выдаткі.

На фабрыцы імя Крупскай замест устаноўленага запасу сыр'цу на 110 тыс. руб. ёсьць запас на 370 тыс. руб. На іншых фабрыках Белшэйаб'яднаньня ўвесь час назіраецца ненармальнае накапленьне матар'ялаў. У выніку, Белшэйаб'яднаньне перавысіла ліміты на паўтара мільёны рублёў.

Фабрыка «Беларуска» за апошнія два месяцы выдаткавала на на-за плянавае будаўніцтва звыш 11 тыс. руб., у зьвязку з чым перавышан ліміт і стварыліся труднасьці з аплатай зарплаты.

Завод «Бальшавік», замест вызначанага на плян зьніжэньня сабекошту прадукцыі у першым квартале на 2 проц., зьвысіў яго ў студзені на 0,2 проц., у лютым—на 0,5 проц. Штатны лік рабочых перапавялічаны: у студзені працавала лішніх 98 рабочых, у лютым—45. Гэта прывяло да перавышэньня лімітаў на 11 тыс. руб. Акрамі таго, са зваротных сродкаў выдаткавана на будаўніцтва 6 тыс. руб.

### „ГРАНДЫЁЗНЫЯ“ ПРАЕКТЫ БЕЛМЯСА

Вось характэрны прыклад бязадказнасьці ў выкананьні пляну. На запатрабаваньне Дзяржбанку Белмяса прысылае зусім нераспрацаваны квартальны фінансавы плян. У ім на 1-га красавіка праектуецца запазычанасьць Дзяржбанку на 5.400.000 руб., у той час, як уся запазычанасьць Белмяса банку на 1-га сакавіка складае 3.600.000 руб.

Цікава ведаць, якія «грандыёзныя» мерапрыемствы праектуе Белмяса, калі яно толькі за адзін месяц мяркуе выдатказаць 50 проц. сваёй запазычанасьці (1.800.000).

### ХАОС У ЛЕСБЕЛЕ

Поўны фінансавы хаос пануе ў Лесбеле, які нашчэ быў да 1-га студзеня перайсьці на гаспадарчы разрахунак, але дагэтуль ён не праведзен. Справаздачнага балянсу няма нават на 1-га кастрычніка 1930 г.

Нескладаньне плянавага балянсу за першы квартал кажа аб дрэнным выкананьні фінансавага пляну. Лесбел нават ня ведае, колькі засталося ў яго драўніны. Плян рэалізацыі прадуктаў за студзень і люты выкананы на 46,1 проц., нерэалізавана прадукцыі на 5 млн. руб. Лесбел ня ведае аб сабекошце прадукцыі нават за асобны квартал. Але ўсе паказальнікі гаворыць за тое, што сабекошт значна павышан, замест вызначанага зьніжэньня на 8,7 проц.

Лесбел практыкаваў скарыстаньне зваротных сродкаў на зьвышлянавае капітальнае будаўніцтва. Такое становішча прывяло да таго, што ўжо да 10 сакавіка Лесбел поўнасьцю скарыстаў квартальны ліміт.

* * *

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што Установы і прадпрыемствы

# Моцную кармавую базу—сацыялістычнай жывёлагадоўлі у бой за кармы

## Адозва цэнтральнага кармавога штабу

### Да ўсіх калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і бядняцка-серадняцкага актыву вёскі

### да ўсіх вясковых партыйных і камсамольскіх арганізацый, да ўсіх зямельных, калгасных і каапэрацыйных арганізацый, да ўсяго савецкага друку

VI Усесаюзны зьезд саветаў на аснове настаноў партыі паставіў перад краінай за усю шырыню задачу разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце і рашучай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ў прыватнасьці жывёлагадоўлі. Вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы поўнасьцю зараз важнейшай палітычнай справай кожнага калгасьніка, рабочага саўгасу, кожнага партыйца, камсамольца, усім савецкай грамадзкасьці.

Праведзячы бязьлітасную барацьбу з ухілам ад генэральнай лініі партыі, з правым ухілам як галоўнай небясьпекай на даным этапе, «левым» апартунізмам і прымірэнцтвам з імі, партыя у мінулым годзе дабілася вялізарных, рашаючых посьпехаў на жывёлагадоўным фронце. У трэці рашэючы год пяцігодкі неабходна па-баявому разгарнуць ПАХОД НА КАРМАВЫМ ФРОНЦЕ, выпраўляючы на аснове разгорваньня жорсткай самакрытыкі дапушчаныя памылкі, даючы бязьлітасны і руйнуючы адпор кулацкай агітацыі, а бальшавіцкай пасьлядоўнасьцю вядучы барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай разгортваньня магутнай кармавой базы.

Для кіраўніцтва паходам агітмасавы сэктар ЦК УсеКП(б) арганізаваў кармавы штаб у складзе прадстаўнікоў ЦК УсеЛКСМ, культсэктару ЦК УсеКП(б), газэт «Правда», «Соц. земледелие», «Комсомольская правда», «Крестьянская газета», Радыёцэнтру, часопісі «Ударники полей» і інш., пры непасрэдным удзеле НК-РСІ СССР і РСФСР, УсеЦСПС і НКЗ СССР.

Кармавы штаб абвясьціў паход за сапраўды бальшавіцкую мабілізацыю кармавых рэсурсаў (сена, фуражу, коранаплодаў, сапомы), якія забясьпечваюць баявыя тэмпы бальшавіцкай сяўбы, і за стварэньне магутнага КАРМАВОГА ФОНДУ краіны для сацыялістычнай жывёлагадоўлі (сілас, коранаплоды, грубыя кормы і г. д.).

На ўвесь час паходу кармавога штабу дзейнічаюць 11 асноўных БРЫГАДНЫХ МАРШРУТАЎ, якія ахапляюць галоўнейшыя вучасткі работы па кормазда-быванні.

У дапамогу штабу створаны ўдарныя рабкораўскія брыгады і ПАСТЫ ШТАБУ для пастаяннай праверкі выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па падрыхтоўцы і правядзеньні пасеўнай кампаніі кармавых культур і сілясным будаўніцтве.

Усе АБЛАСНЫЯ і РАЁННЫЯ ГАЗЭТЫ, створеныя ў батальёны энтузіястаў, мабілізуюцца на кармавы фронт, уключаючыся ў паход, арганізуюць па прыкладу цэнтральнага друку кармавы штабы, выкарыстаўшы ўсе сродкі, якія здольны забясьпечыць разгортваньне і ставарэньне магутнай кармавой базы.

Вялікія гаспадарча-палітычныя задачы штабу, які арганізуе паход за кармы, ня можа не знайсьці сустрэчнай шырокай ініцыятывы калгасных, бядняцка-серадняцкіх мас, камсамолу вёскі і ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Калгасьнікі, рабочыя, камсамольцы, селькоры. Мабілізуйцеся на кармавы фронт, падхопліваўшы пачатую намі масавую кампанію. Квадкладна праверце, ці даведзен пасеўны плян кармавых культур да саўгасу, калгасу, да кожнага калгасьніка і аднаасобнага двара, у прыватнасьці, ці ёсьць пасеўныя матар'ялы кармавых расьлін і сілясных культур, ці праведзен рамонт с.-г. машын. Арганізуйце правільную расстаноўку рабочай сілы да надыходзячых пасеўных работ. Арганізуйце падрыхтоўку кадраў кармавікоў-інструктароў.

Камсамольцы, ударнікі і рабкоры заводаў, якія вырабляюць машыны і с.-г. прылады. Арганізуйце брыгады дапамогі паходу за кармавую базу сац. жывёлагадоўлі. Забясьпечце хутчэйшае прасоўваньне с.-г. машын і сілясных вежаў на рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Кармавы штаб зварачаецца да ўсёй савецкай грамадзкасьці краіны з заклікам аказаць пачатаму паходу бальшавіцкую дапамогу і ўсямерную садзейнасьць.

Шырэй разгортвайце сацыялістычнае спаборніцтва паміж раёнамі, калгасамі і камсамольскімі ячэйкамі. Па прыкладу Ніжняволскага краю выклікайце іншыя вобласьці і раёны. Будзьце і тут першымі памочнікамі бальшавіцкай партыі ў арганізацыі правядзеньня важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі на кармавым фронце.

Шырэй, па-бальшавіцку разгортвайце паход!

Старшыня Цэнтральнага кармавога штабу друку
С. БУДЗЕННЫ.

Калгасьнік-ударнік вялікага двара

## Аддзелам агітмасавых кампаній ЦК УсеКП(б) арганізован кармавы штаб

### С. М. Будзённы—старшыня кармавога штабу

У мэтах ўсямернай грамадзкай садзейнасьці справе стварэньня і ўмацаваньня кармавой базы, якая зьяўляецца асновай жывёлагадоўчай праблемы, яна патрабуе да сябе выключнай увагі і напружаньня грамадзкіх сіл.

Скліканая агітмасавым аддзелам ЦК УсеКП(б) спэцыяльная на кармах шырокая нарада прадстаўнікоў калгаснакаапэрацыйных арганізацый, НКЗ СССР і РСФСР і рэдакцый цэнтральных газэт прызнала неабходным арганізаваць грамадзкі кармовы штаб.

Задачы штабу наступныя:

— Мабілізацыя (праз друк. Саюзкіно, АКР, хаты-чытальні і г. д.) калгасных, саўгасных, бядняцка-серадняцкіх мас і вясковага камсамолу на хутчэйшае стварэньне і ўмацаваньне кармавой базы.

— Арганізацыя грамадзкага кантролю і садзейнасьці ў рабоце калгасна-каапэрацыйных і гаспадарчых устаноў і ворогатанаў у частцы кормазда-быванньня.

Старшынём штабу выбран С. М. Будзённы.

Штаб арганізуе маршруты спэцыялізаваных брыгад масавых с.-г. і агратэхнічных аддзелаў газэт, камсамолу і аграспэцыялістаў.

Маршруты распрацаваны на ўсіх галоўнейшых вучастках работы па кормах: маршрут мабілізацыі кармавых рэсурсаў краіны для правядзеньня рашэючай бальшавіцкай сяўбы, сілясны маршрут, кукурузна-соевы, маршрут сенаўборачнай кампаніі і г. д.

У кожнай інструктарскай брыгадзе, якая выязджае на месца, прымаюць удзел: арганізатар-масавік, журналіст і аграспэцыяліст.

Кармавы штабы друку вызначана стварыць ва ўсіх асноўных центрах Саюзу Харкаве Ростове, Ленінградзе і г. д. У раёне арганізуюцца штабныя тройкі в прадстаўнікоў мясцовай газэты, райкому камсамолу і райза. Будзе правядзена масавая арганізацыя рабселькораўскіх пастоў на вуалавых станцыях чыгункі, у раёнах і г. д.

У кармавы штаб уваходзяць: ЦК УсеЛКСМ, культпроп ЦК УсеКП(б), газэты «Правда», «Соц. земледелие», «Комсомольская правда», «Известия», «Крестьянская газета», «Гудок», часопісь «Ударники полей», Радыёцэнтр, Саюзкіно, АКР і інш. Штаб працуе пры непасрэдным удзеле Камісіі выканаўчага Саўнаркому, НК-РСІ СССР і РСФСР і УсеЦСПС. НКЗ СССР і РСФСР, вучоных кансультантаў с.-г. акадэміі імя Леніна, Інстытут кармоў і Інстытуту сої і г. д.

Арганізавана журналісцкая ўдарная брыгада ў дапамогу штабу ў складзе Д. Заслаўскага, Дові, Ефімава і інш. з аддзелам Д. Беднага і М Кальцова.

## Бязьдзейнасьць ячэйкі выкарысшоўвае клясавы вораг

Магільнянская парт'ячэйка (Вузьдзенскі раён) стаіць у баку ад выкананьня дырэктыў партыі па калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Адсутнасьць кіраўніцтва з боку ячэйкі калгасам імя Сталіна зьяўляецца асноўнай прычынай тых буйных прарываў, якія маюць месца ў гэтай гаспадарцы. Будаўніцтва, якое было вызначана на мінулы год, сарвана. Калгас атрымаў 35 тысяч руб.

Безгаспадарчасьць у калгасе мяжуецца са шкодніцтвам. Ня гледзячы на тое, што кармоў было загатоўлена даволі, зараз ужо няма чым карміць жывёлу па той прычыне, што кармы раздаваліся безгаспадарча, а частка іх проста расьцягнута.

Кулацкія элементы выкарыстоўваюць факты безгаспадарчасьці ў сваёй варожай агітацыі супроць калгаснага руху. Але кіраўніцтва ячэйкі і калгасу, апынуўшыся ў балоце апартунізму, ня лічыць патрэбным арганізоўваць калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы на барацьбу з клясавым ворагам, ня прымае нішых захадаў для ўздарэньня становішча ў калгасе, для вычышчэньня яго ад кулацкіх элементаў.

КАЛГАСЬНІК.

III-ці Усебеларускі зьезд калгасаў

## Умелага кіраўніцтва і сваячасовай тэхнічнай дапамогі

23-га сакавіка — дзень жывёлагадоўлі на Усебеларускім зьезьдзе калгасаў. Гэтаму пытаньню прысьвечана амаль усё раніцкае і вячэрняе пасяджэньні зьезду.

З вялікай уважлівасьцю слухаюць дэлегаты даклад намесьніка старшыні Белкалгасцэнтру тав. Стрэле.

Шпарэйя тэмпы індустрыялізацыі, рост рабочай клясы і не задавальненні высоўваюць зараз жывёлагадоўлю, як адну з важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва. Задатрабаваньні да жывёлагадоўлі будуць расьці з кожным днём.

Жывёлагадоўчую праблему, як і збожжавую — падкрэсьлівае дакладчык — наша партыя вырашае шляхам стварэньня буйной сацыялістычнай гаспадаркі, шляхам стварэньня жывёлагадоўчых калгасаў і саўгасаў.

У выніку напружанай работы мы ўжо маем поўныя дасягненьні ў галіне развіцьця жывёлагадоўлі ў сацыялістычным сэктары. Па няпоўных вестках за апошні квартал 1930 г. колькасьць буйной рагатай жывёлы павялічылася на 2 проц. у парахвальні в першым кварталам, а колькасьць сьвіней—на 26 проц. На 1-га сакавіка мы ўжо маем 508 спэцыялізаваных малочна-жывёлагадоўчых калгасаў, у якіх пастаўлены 41.772 каровы, і 742 сьвінагадоўчых калгасы в 35 тыс. сьвіноматак.

Далей тав. Стрэле спыняецца на тым, што некаторыя раёны зусім недаацэньваюць значэньня сьвінагадоўлі. Так, Асінавецкі раён замест 525 сьвіноматак паставіў 78, а 9 сьвінарнікаў пабудаваны толькі адзін. Хойніцкі раён выканаў заданьне па ўкамплектаваньні сьвіноматкамі толькі на 13,2 проц. На заготоўчых пунктах мелася каля 600 сьвіноматак, але Райкалгасаюз адмовіўся іх прыняць. Тут мы маем яўнае нежаданьне выконваць дырэктывы партыі, яўны правы апартунізм на практыцы.

На 1931 год калгасная сыстэма дано вялізарнейшае заданьне, калгасы павінны мець на менш 50 проц. усёй прадукцыйнай жывёлы. Стада буйной рагатай жывёлы ў калгасах трэба давесьці да 1.063 тысяч, у тым ліку 610 тысяч павінны быць абагулены. Неабходна забясьпечыць адачу дзяржаве на менш 46 тысяч тон таварнага малака. У галіне сьвінагадоўлі неабходна давесьці стада сьвіней да 1.120 тысяч штук, арганізаваць 1.500 высока-таварных сьвінаводчых калгасных фэрм і пазбавіць там ня менш 150 тысяч сьвіноматак. Буйныя заданьні мы маем і на птушніцтве і трусагадоўлі.

Гэта вялізерная праграма — казала тав. Стрэле — патрабуе напружанай работы. Перш за ўсё каб яе выканаць, трэба зьвярнуць увагу на стварэньне кармавой базы. Таму, рыхтуючыся да сяўбы, мы павінны засеяць у калгасах ня менш 217 тысяч гэкт. бульбы, 32 тыс. гэкт. кармавых коранаплодаў, 20 тысяч гэкт. сілясных культур, 99 тыс. гэкт. аднагадовых траў і 119 тыс. гэкт. канюшыны. Мы павінны ў гэтым годзе засілаваць 502 тыс. тон зялёнай масы. Асноўную масу сілясу мы будзем класьці ў ямы і траншэі. Падрыхтоўку іх неабходна пачаць з самай ранняй вясны, каб скончыць не пазьней 1-га пілення.

Трэба самым рашучым чынам змагацца з такім зьявішчам, калі ў нас абагульваньне буйной рагатай жывёлы значна адстае ад тэмпаў калектывізацыі. Неабходна работу арганізаваць так, каб рабочая буйная рагатая жывёла абагульвалася адразу пасьля прыняцьця статуту і ягодна статуту. Але пры абагульваньні ні ў якім разе нельга дапускаць перагібаў. Разам з гэтым калгасы самі павінны змагацца з тымі, хто да ўступленьня ў калгас разбазарвае сваю жывёлу, бо такія калгасьнікі зьяўляюцца ворагамі калгаснага будаўніцтва.

Далей дакладчык завастрае ўвагу зьезду на пытаньнях арганізацыі працы ў жывёлагадоўчых калгасах. Рад калгасаў дагэтуль ашчэ не ўвялі ў сабе такога простага мерапрыемства, як сталыя брыгады для догляду жывёлы. Апошняя даглядаецца ў парадку чарг. Нормы выпрацоўкі, зьдзельшчына зусім ня ўжываюцца. Есьць калгасы, дзе догляд сьвіней лічыцца чайгорнай работай, ніхто ня хоча ісьці даглядаць сьвіней. Трэба рашуча змагацца з такой недаацэнкай справы сьвінагадоўлі, якая зьяўляецца адным з асноўных сродкаў у вырашэньні мясной праблемы.

За памяшканьне ўдою, за дробны догляд жывёлы павінны адказваць тыя, якім гэта даручана, ня толькі маральна, але і матар'яльна. Лепшых калгасьлікаў, якія дабіліся лепшага ўдою, большага выхаду парасят мы павінны прэміяваць.

Пытаньне павышэньня таварнасьці ў жывёлагадоўчых калгасах набывае цяпер значнае значэньне. Адзіны верны шлях для стварэньня матэрыяльнай таварнасьці ў калгасах — указвае дакладчык — зьяўляецца будаўніцтва буйных, спэцыялізаваных малочных і сьвінаводных таварных фэрм, якія існуюць на дагаворных пачатках. Зараз пры Белкалгасцэнтры створаны два центры — малочны і сьвінагадоўчы. Яны павінны абяцаць і абслугоўваць усе таварныя фэрмы. Яны будуць заключаць дагаворы з калгасамі і забясьпечваць іх крэдытамі, матар'ялам і неабходнымі кармамі, а калгасы ў сваю чаргу павінны будуць аддаваць прадукцыю па ўказаньні гэтых центраў.

Спыняючыся на будаўніцтве ў калгасах, дакладчык канстатуе, што справа з вывазкай лесаматар'ялаў усё яшчэ ідзе дрэнна. У гэтым годзе мы ня змогам задаволіць усе патрабаваньні на дэфіцытныя матар'ялы. Таму трэба зьвярнуць увагу на скарыстаньне мясцовых рэсурсаў, трэба адмовіцца ад цэменту, замяніўшы яго вапняна-шлакавай мяшанай. Неабходна спрасьціць канструкцыі будынкаў.

Нарэшце пытаньне гадоўлі коняй і конскай цягавай сілы. Ня гледзячы на ўкараненьне трактараў у с.-гаспадарку, конская цягавая сіла яшчэ доўга будзе займаць вялікае месца ў нашай гаспадарцы. Таму мы павінны ўсімі мерамі разьвіваць канягадоўлю, планаваць аб цягавай сіле. Зараз-жа ў радзе калгасаў недаацэньваюць значэньня каня. Як толькі ў рабоце зьяўляецца машынна-трактарная станцыя — кожны старшыня калгасу лічыць патрэбным прадаць каня. У выніку мы зараз маем такое становішча, калі на аднаго каня ў калгасе прыпадае 9,6 гэкт. пахаці. Гэта нагрузка надзвычай вялікая. Мы лічым, што нармальная нагрузка зьяўляецца 6 гэкт.

Калгасы павінны не аслабляць увагі цягавай сіле. А ад яе ў значнай ступені залежыць пасьпяховае правядзеньне другой калгаснай вясны.

З дакладам аб арганізацыі малочных і сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм на зьезьдзе выступілі т.т. Самусевіч і Красоўскі.

* * *

Будаўніцтва і кармы — вось асноўныя моманты, вакол якіх разгарнуліся вельмі ажыўленыя спрэчкі на дакладах аб жывёлагадоўлі на вячэрнім пасяджэньні Усебеларускага зьезду калгасаў ад 23-га сакавіка.

Зусім зразумела, што ад сваячасовага і поўнага выкананьня плану будаўніцтва ў калгасах будзе залежыць пазьняхоўнае вырашэньне мясной праблемы, выкананьне праграмы жывёлагадоўлі 1931 году.

У мінулым годзе мы выканалі плян будаўніцтва ў калгасах толькі ў разьмеры 60 проц. Ва многіх мясцох было дапушчана шмат памылак. Білі нанатэпам спрошчаныя тыповыя праекты будаўніцтва. Многія дэлегаты зусім правільна задаюць пытаньне: дзе быў Калгасцэнтр заготуць? Чаму праекты ня былі дасланы раней?

**Умелага кіраўніцтва, сваячасовай тэхнічнай дапамогі** — вось чаго патрабуюць раёны ад Белкалгасцэнтру. Гэта зрываецца в пусткай амаль кожнага праекту, які закранаў пытаньне будаўніцтва. Больш практычных пазыцыяў, як канкрэтна рабіць, менш агульных разважаньняў, якімі так захапляецца большасьць інструкцый, што рассылаецца раёнам.

У затрудненьнях з кармамі та многім пінаваты самі калгасы. Гэта ўжо зараз зразумела ўсім. Па-першае, не зьвярталіся належнай увагі на ўборку, на-другое нерацыянальна скарыстоўвалі корм. Як правільна заўважыў адзін з дэлегатаў, восенью давалі жывёле столькі сена, колькі магла падняць на вілы, а зараз не хапае кармоў. Вінаваты ў гэтым і прадстаўнікі Белкалгасцэнтру, якія часамі няправільна арыентавалі калгасы, абяцаючы ім заваёзць кармы, а потым ня выконвалі свае абяцаньні. Калгасы чакалі, а самі не праўдзівы наладзілі ініцыятывы.

Рад дэлегатаў указваюць на дрэннае ветэрынарнае абслугоўваньне і нерацыянальнае разьмяшчэньне ветэрынарных сіл. Мы маем факты, калі ў ільнаводчых раёнах ёсьць па некалькі ветэрынарных дактароў, у той час, калі ў жывёлагадоўчых няма ні аднаго.

На зьезьдзе

Сёньня—дзень агляду МТС

## Сустрэць вясну падрыхтаванымі

БССР сёлета пакрываецца сеткай машына-трактарных станцый. Трактарны парк будзе даведзен да 1.162 адзінак. Капітальныя ўкладаньні ў будаўніцтва МТС вызначаны ў 7 млн. руб.

Многія МТС па-бальшавіцку перакінуліся на падрыхтоўку да сяўбы і ў гэтай галіне дабіліся поўных посьпехаў.

Аднак, па асобных вучастках з выкананьнем пасеўнага пляну становішча далёка незадавальняючае. Па некаторых МТС няма яшчэ дакладнай работы і напружаньня сіл на фарсаваньні падрыхтоўкі да сяўбы.

МТС у падыходзячую веснавую пасеўную кампанію павінны будуць апрацаваць 218.000 гэкт. гэтай сілай займаць у першую чаргу кіраўніцкі калгас. Плян дагаворнай кампаніі з калгасамі выкананы на 15 сакавіка на 60 проц. Заключаны дагаворы в 1.016 калгасамі.

У выніку шырокай растлумачальнай работы і аказаньня МТС калгасам практычнай дапамогі ў арганізацыі працы ў часе дагаворнай кампаніі арганізаваны 333 калгасы. Некаторыя МТС дабіліся буйных посьпехаў у арганізацыі новага калгаснага прыпіву. Так, Мсьціслаўская МТС за адзін-паўтара месяца арганізавала 43 калгасы, Вушацкая — 41, Койданаўская — 31, Сеньвенская — 25 калгасаў. Мсьціслаўская МТС выканала плян дагаворнай кампаніі на 102 проц., Койданаўская — 157 проц., Танежыцкая — 129 проц., Смалявіцкая — 107 проц., Каймавіцкая — 102 проц. Ганебна адстаюць Асьвейская МТС, якая закінула дагаворы толькі на 36 проц., Ветрынская — 55 проц., Сіроцінская — 48 проц. і Стара-Дарожная МТС — 33 проц.

Па МТС плян рамонту трактараў выкананы на 80 проц. Значна горш па калгасна-каапэрацыйных сыстэмах, дзе адремантавана ўсяго 46 проц. трактараў. Райза і райкалгасаюзы марудзяць з дастаўкай трактараў у майстэрні, да якіх яны прымацаваны. Дрэнна з завозам запасных частак да трактараў. Не хапае падшыпнікаў, шатуноў і г. д.

Пытаньне аб сеўцах насеньня пазбывае зараз значэньне аднаго з важнейшых зьвеньняў, якое павінна забясьпечыць посьпех сяўбы. Аднак, тэмпы ссыпкі не гарантуюць выкананьня вызначаных пляноў. Так, насеньне ранніх культур сабрана прыблізна 75 проц., позьніх культур—усяго толькі 33 проц. У гэтай галіне трэба безадкладна дабіцца пералому. Насеньне на МТС павінна быць сабрана поўнасьцю.

На многіх пунктах у Шклове, Асінаўцы, Бурбіне, Церахоўцы, Стары-Дарогі дагэтуль ашчэ не ўстаноўлены нафтавыя бакі. Устаноўцы іх у радзе выпадкаў перашкаджае чыгуначная адміністрацыя, якая адводзіць непадыходзячыя месцы. Завоз нафты працягваецца незадавальняюча. На лініі Белкаапсаюзу завезена толькі 50-60 проц. нафты. Бракасьць бакаў на большасьці МТС не адпавядае патрэбнасьці. Так, у Вушацкім раёне ўстаноўлен бак на 9 замест 96 тон.

Тое-ж самае і з тарай. МТС маюць 718 бочак замест патрэбных 2.383. Белсампрамсаюз абавязаўся зрабіць 1.500 драўляных бочак, а пакуль што зробле-на толькі 30.

На многіх МТС разгарнулася работа па падрыхтоўцы кадраў. Падрыхтоўваецца 3.712 малодшых рулавых і 590 шафёраў. Курсамі выпушчана 49 разьбіўных механікаў і 197 старэйшых трактарыстаў. Дырэктарамі, намесьнікамі іх і інструктарамі на арганізаваньні работы МТС укамплектаваны Агранамаў ёсьць 62, што амаль адпавядае патрэбе ў іх.

У некаторых раёнах мясцовыя арганізацыі праявляюць апартуністычную недаацэнку МТС і не аказваюць ім належнай дапамогі. У Дзьвенскім раёне на агра-пункце ляжыць сена і провы, а трактары МТС пастаўлены у 11 прыпалных клявох. Стара-дарэскія раённыя арганізацыі не здавальняюць заяўкі МТС на будаўнічыя матар'ялы.

Такім адносінам да МТС трэба даць самы рашучы адпор. МТС, як апорным пунктам сацыяльнай калектывізацыі на вёсцы, павінна быць забясьпечана поўнай дапамогі з боку усіх парэнных, сьвецкіх і грамадзкіх арганізацый.

Сёньня, у дзень агляду МТС, трэба вызвіць, наколькі МТС і калгасы, якія імі абслугоўваюцца, падрыхтаваны да другой бальшавіцкай вясны.

Агляд павінен ператварыцца ў масавую гаспадарча-палітычную кампанію па мабілізацыі калгасьніцтва і бядняцка-серадняцкіх мас ва ўмацаваньні работы МТС. Дзень агляду павінен зьявіцца пераломным мэтынгам у падрыхтоўцы МТС да веснавой сяўбы.

К.

## „Зьвязда" уключаецца у паход за кармы

**Падвядзеньне кармавой базы пад сацыялістычную жывёлагадоўлю падвінна вырашыць мясную праблему ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. «Зьвязда» падтрымлівае арганізацыю ўсесаюзнага кармавога штабу і ўключаецца ў паход за кармы.**

**Для практычнага вырашэньня гэтага пытаньня рэдакцыяй склікаецца на 28-III нарада з прадстаўнікоў ад газэт: «Рабочай», «Калгасьнік Беларусі», «Савецкая Беларусь», «Чырвоная Зьмена», і «Сельгаспрабочы», прадстаўнікоў цэнтральных устаноў—НКЗБ, Белкалгасцэнтру, Белсельтрасту, Сьвінаводу, Маслатрэсту, Жывёловодсаюзу, Белкаапсаюзу, Насеннаводсаюзу, ВСКГБ, Белсельбуду.**

**На абгаварэньне нарады прапануюцца наступныя пытаньні:**

**1. Мабілізацыя кармавых рэсурсаў да веснавой сяўбы ў 1931 г.**

**2. Барацьба за выкананьне пасеўных пляноў кармавых культур.**

**3. Сілясная будаўніцтва.**

**Просьба да арганізацый, якія павінны прыслаць сваіх прадстаўнікоў на нараду, каб апошнія зьявіліся ў рэдакцыю 28-III у 6 гадз. вечара—Савецкая, 63, III-ці паверх.**

# Бальшавіцкая праграма калгаснай жывёлагадоўлі

Жывёлагадоўчая праблема, як і збожжавая, вырашаецца на лініі ўзьнікненьня і ўмацаваньня жывёлагадоўлі шляхам перш за ўсё арганізацыі спэцыяльных і жывёлагадоўчых саўгасаў, аналёгічна збожжасаўгасаў, масавага стварэньня высокатаварных калгасных фэрм і кутка гаспадарцы кармавой базы» (XVI зьезд УсеКП(б).

Лажыцыцыяючы генэральную лінію партыі, калгасная сыстэма БССР ужо у першым годзе масавага калгаснага руху дабілася значных посьпехаў у галіне арганізацыі калгаснага агрэмаджанага стада.

У 1929 годзе 1.713 калгасаў мелі 57.946 кароў—у сярэднім 33,8 шт. на адзін калгас, а ў 1930 годзе—3.021 калгас мелі 156.874 каровы—у сярэднім 51,9 шт. на адзін калгас.

У параўнаньні з індывідуальным сэктарам калгасы ў 1930 годзе мелі на 100 гэкт. пахаці 25,2 кароў супроць 21,8 на індывідуальным сэктары.

**Па БССР вызначана 560 спэцыяльных малочна - жывёлагадоўчых калгасаў, у якіх пастаўлена 39.400 агрэмаджаных кароў, што складае 97,5 проц. пляновага заданьня.**

Асабліва бурна ў калгасах разьвіваецца сьвінагадоўля. **Колькасьць сьвіней у калгасах за адзін год павялічылася ў 7 раз: з 30.404 шт. у 1929 годзе—да 210.000 шт. у 1930 годзе.** Вылучана 586 спэцыяльных сьвінагалоўчых калгасаў, у якіх пастаўлена 31.000 сьвіноматак, або 65,75 проц. пляну.

Усе гэтыя дасягненьні і посьпехі калгаснага будаўніцтва ў галіне жывёлагадоўлі лашчэнту разьбілі правапартуністычныя стэорыі аб банкрутстве жывёлагадоўлі і яркі пацьвердзілі правільнасьць генэральнай лініі нашай партыі, накіраванай на стварэньне буйных жывёлагадоўчых саўгасаў і высокатаварных калгасных фэрм.

Аднак, паказаныя посьпехі і дасягненьні маглі быць яшчэ большымі, калі-б ня былі дапушчаны буйнейшыя памылкі і недахопы ў гэтай важнейшай справе.

Частка калгасаў і работнікаў райкалгасаюзаў праявіла недаацэнку важнейшых мерапрыемстваў партыі ў галіне жывёлагадоўлі. **Праграма будаўніцтва выкананa—па сьвінагадоўлі толькі на 65,5 проц., а па буйной жывёле—на 60 проц.** Дрэнна арганізавана праца на ўтрыманьні і доглядзе жывёлы, што, бязумоўна, адбілася на колькасьці і якасьці таварнай жывёлагадоўчай прадукцыі.

Асноўнай прычынай труднасьцяй в забясьпечаньнем кармамі калгаснай жывёлы ў сучасны момант зьяўляецца невыкананьне ў 1930 годзе пляну сілясаваньня (замест 450 тысяч тон, паводле заданьня, засілавана толькі 36 тысяч—усяго 8 проц.). Многія калгасы дрэнна правялі ўборку сенажацяй; не ўстанавілі эканомных норм харчаваньня жывёлы, но пабудавалі кармушак, не ўцяплілі хлявоў, ня ўсюды выкарыстоўваюцца адходы і адкіды харчовай прамысловасьці (барда, мяга) і г. д.

Калгасы павінны свае стада буйной рагатай жывёлы давесьці да **1.063.500 шт.** (у тым ліку **610.200 шт.** будзе агрэмаджаных), вырабляць **330 тысяч цялят** (з якіх **180 тыс.** ад агрэмаджаных кароў) і **150 тысяч** цялят ад неагрэмаджаных кароў. Павысіць удой малака на спэцыяльных фэрмах ня менш як да 1.500 літраў і па астатніх калгасах ня менш як да 1.200 літраў у год у сярэднім ад кожнай каровы. Забясьпечыць адачу таварнай прадукцыі малака ня менш 46 тысяч тон. Лік бугаёў—пытворнікаў давесьці ў калгасах да 17.300 галоў. Калгасам перадаецца для камплектаваньня агрэмаджанага стада з загатоўчых пунктаў 21.800 кароў, 20.00 нецеляў, 50.000 цялят.

Трэба лічыць абсалютна недапушчальным адставаньне агрэмаджаньня жывёлы ад тэмпаў калектывізацыі. Агрэмаджаньне жывёлы неабходна праводзіць, згодна статуту калгасу, безадкладна, зараз-жа пасьля прыняцьця статуту і афармленьня калгасу.

Многія 2-х і больш кароўныя сераднякіцкія гаспадаркі перад уваходам у калгас, пад уплывам кулацтва, разбазараюць сваю жывёлу і гэтым самым зрываюць арганізацыю калгасных фэрм. У мэтах барацьбы са зьнішчэньнем жывёлы і поўнай перамогі над кулаком, трэба приста ня прымаць у калгасы такія гаспадаркі.

**Гаспадаркі, якія пад уплывам кулацтва зьнішчаюць ці разбазараюць сваю жывёлу, фактычна зьяўляюцца сэкэньнікам кулака і да іх трэба адносіцца як да ворагаў калгаснага будаўніцтва.** Можна дапусьціць, у парадку выключэньня, прыём у калгасы гэтых гаспадарак толькі ў тых выпадках, калі яны ўсьведамляюць сваю віну перад рабочай клясай і калгасамі, і калі яны ўнясуць у калгасы поўную каштоўнасьць разбазараванай жывёлы.

Палаўняць агрэмаджанае стада калгасаў трэба таксама і шляхам куплі ў калгасьнікаў і аднаасобнікаў лепшых кароў—матак, вытворцаў і цялят. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на куплю лепшых цялят ад народзістых кароў гарадоў і мястэчак.

У калгасах неабходна стварыць племянныя гнёзды буйной рагатай жывёлы як з чыстапародных жывёлы, так і з мясцовай палепшанай мотысаванай і наогул высока-прадукцыйнай жывёлы.

На мотысацыю жывёлы неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу і паставіць задачай усіх калгасаў, каб быў у калгасах былі-б выключна пародзістыя.

### СЬВІНЯ ПАВІННА

быць у центры ўвагі ўсёй калгаснай грамадзкасьці.

У 1931 годзе калгасы павінны свае стада сьвіней давесьці да 1.020 тысяч. **Каля паловы ўсіх сьвіней БССР будзе ў калгасах.** Калгасы аладуць у 1931 годзе для рабочага забясьпечаньня ня менш 150 тысяч штук адкормленых сьвіней.

Для выкананьня гэтай праграмы неабходна паставіць ня менш 150 тысяч сьвіноматак у спэцыяльных сьвінагадоўчых калгасных фэрмах і ня менш 22.500 сьвіноматак у астатніх калгасах.

Трэба пакланіціца, каб гэтыя жывыя варштаты—сьвіноматкі не сталі халастымі. Калгасы павінны мець 6200 кнароў - вытворнікаў. Неабходна зьвярнуць асаблівую увагу на падбор народзістых кнароў-вытворнікаў, на мотысацыю сьвіні.

### КОНСКАЯ ЦЯГАВАЯ СІЛА

побач з разьвіцьцём машына-трактарных станцый ашчэ доўгі час будзе займаць вялікае месца ў сельскай гаспадарцы. Трэба змагацца за кожнага працаздольнага калгаснага каня і арганізаваць выгадавальнае пакаленьнага і народзістага маладняка. У 1931 годзе неабходна арганізаваць 7 разведгуртоў для гадаваньня маладняка ў колькасьці 350 шт.; племянны склад кобыламатак давесьці да 690 шт. і для забясьпечаньня адучной кампаніі лік племянных жарабцоў давесьці да 1.100 шт.

Мерапрыемствы па разьвіцьці і палепшэньні каня патрабуюцца такіма і гатарэсамі абароны нашай сацыялістычнай краіны. Таму мы павінны абавязаць бязьлітасную барацьбу з тымі, хто садзейнічае разбазараньню коняй і фактычна дапамагае ворагам савецкай краіны.

### ПТУШКА І ТРУСЫ

У калектыўнай гаспадарцы ў самы кароткі час могуць і павінны даць такі прыбытак, як ні адна галіна гаспадаркі. Для гэтага неабходна ў першую чаргу перамачы кансерватызм кіраўніцкіх калгасаў і многіх калгасьлікаў, якія па-дзедаўску лічаць, што курыца ёсьць справа бабская, што трусамі могуць займацца толькі аматары.

Птушніцтва і трусагадоўлю мы павінны паставіць на прамысловыя рэйкі і прымусіць гэтай справай займацца ў першую чаргу кіраўніцкі калгасы. Намечаная праграма па арганізацыі 123 птушкагадоўчых калгасаў, на будове 34 інкубатараў на 16 тысяч яйцамесц кожны (павінны выпесьці ня менш 246.000 курчанят), па арганізацыі 20 трусагадоўчых гаспадарак з разьвядзеньнем у іх ня менш 20.000 трусоў—павінна і будзе калгасамі выканана і перавыкананa.

### КАРМАВОЕ ПЫТАНЬНЕ

зьяўляецца вузлавым пытаньнем усёй жывёлагадоўчай праблемы, бо ажыцьцяўленьне бальшавіцкай праграмы жывёлагадоўлі залежыць ад вырашэньня кармавой базы.

Вопыт сілясаваньня кармоў даў добрыя вынікі. Сілас сам за сабе смачны.

На БССР у калгасах неабходна пасеець 32 тысячы гэкт. кармавых коранаплодаў, 20 тысяч гэкт. сілясных культур, 99 тыс. гэкт. аднагадовых траў, 119 тысяч гэкт. канюшыны і 217 тыс. гэкт. бульбы. Засілаваць у сезон 1931 году 502 тысячы тон зялёнай масы. Правесьці пазьнейшае сенажацяй на плошчы 163.400 гэкт. Выканаўшы гэту праграму, мы падвядзем базу для выкананьня праграмы на жывёлагадоўлі.

З усёй бальшавіцкай рашучасьцю неабходна змагацца за правільнае харчаваньне і ўтрыманьне жывёлы, даючы рашучы адпор кулацтву і яго ўплыву на калгасныя калгасы і калгасьлікаў.

Калгасцэнтр павінен пакланаціцца аб выдачы раду папулярных плякатаў і брашур па харчаваньні і доглядзе жывёлы в тым, каб кожны калгасьнік ведаў, як трэба змагацца за высокапрадукцыйную калгасную жывёлу.

### АРГАНІЗАЦЫЯ БУЙНЫХ ВЫСОКА - ТАВАРНЫХ КАЛГАСНЫХ ФЭРМ ЗАБЯСЬПЕЧЫМ РАБОЧЫХ МЯСАМ, МАЛАКОМ І ТЛУШЧАМІ.

Мы павінны ва ўсе-б там ні стала вырашыць задачу — арганізаваць буйную, высока-таварную калектыўную жывёл

# Спараная плюс сацыялістычная рэканструкцыя вывядуць транспарт з „вузкага месца“

**Першыя посьпехі спаранай на Гомельскім чыгуначным раёне. Віцебскі вузел усё яшчэ ня зьнішчыў абязьлічкі. На станцыі Полацак 700 неадпраўленых вагонаў**

**Бязьлітасна зламаць супраціўленьне апартуністаў поўнаму пераходу на спараную. Выкараніць рэшткі шкодніцтва!**

## Мабілізавацца на поўнае выкананьне адозвы ЦК і СНК

З дня абвяшчэньня адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК аб чыгуначным транспарце прайшло ўжо каля двух месяцаў. Якія вынікі рэалізацыі гэтай гістарычнай адозвы па Гомельскім эксплёатацыйным раёне? У выніку прапрацоўкі адозвы трэба канстатаваць пад'ём творчага энтузіязму рабочых на ліквідацыю прарываў, на выкананьне трансфінплану.

### Лічбы і факты перамог

Пераход на спараную язду па Гомельскім эксплёатацыйным раёне пачаў праводзіцца з 10 лютага і ў асноўным быў закончан 15 лютага.

На 1 сакавіка на раёне прымацаваны брыгады да 60 пасажырскіх, таварных і манэўровых паравозаў.

Пераход на спараную язду быў спаткаваны з вялікім уздымам. Зараз большасьць паравозных брыгад прымае непасрэдны ўдзел у ачыстцы і рамонце паравозаў, не гаворачы аб тым, што значна палепшыўся штодзенны нагляд за становішчам паравоза з боку брыгад. Зараз ва ўсіх дэпо раёнаў можна бачыць такі малюнак, калі брыгады па 8-10 гадз. свайго адпачынку аддаюць на ўпараднкаваньне паравоза.

### Ні аднаго выпадку псаваньня паравозаў у дарозе

Усё гэта пачынае адбівацца на палепшэньні становішча паравознага парку. Калі ў студзені было **14 выпадкаў** псаваньня паравозаў у дарозе, дык у лютым лік іх зьменшыўся да **8**, а за 17 дзён сакавіка месяца няма **ні аднаго выпадку.**

У першую дэкаду лютага па станцыі Гомель была **21 адмена** адпраўленьня цягнікоў з-за нявыдачы паравозаў, у другой дэкадзе лютага — **дзьве адмены**, а за 17 дзён сакавіка ня было ўжо **ні адной адмены.** Спазьненьняў адпраўленьня цягнікоў з-за нявыдачы паравозаў мы мелі па Гомелі: у студзені — 70 выпадкаў, у лютым—66, а ў сакавіку значна зьменшыўся лік спазьненьняў.

Ёсьць палепшэньне ў якасьці рамонту. У трэцяй дэкадзе студзеня на Гомельскім вузле было **115 выпадкаў паўторнага рамонту**, у першай дэкадзе лютага — 24, у другой дэкадзе — 22 і ў трэцяй — 19.

Сярэдня-сутачны прабег пасажырскіх паравозаў складае за першую дэкаду студзеня 205 клм., таварных—120 клм., а першую дэкаду сакавіка сярэдня-сутачны прабег пасажырскіх паравозаў ужо складае 262 клм. і таварных—142 клм.

### Зрыў спаранай язды—вынік нераспарадчасьці адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу

Паданыя лічбы паказваюць, наколькі правільным зьяўляецца скасаваньне абязьлічкі і пераход на спараную язду. Аднак, трэба адзначыць, што да гэтага часу ёсьць выпадкі зрыву спаранай язды, якія адбываюцца з прычыны зьмены нумароў манэўровых паравозаў, паступленьня паравоза ў рамонт, або на прамыўку, падмены брыгад на час адпачынку. Значная частка гэтых прычын зьяўляецца вынікам **нераспарадчасьці адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, а таксама адсутнасьцю сутачнага пляну і строгага кантролю за поўным выкананьнем вызначанага пляну работ кожнага дэпо.** Часта загадчыкі брыгадамі, нарадчыкі ня ўмеюць арганізаваць своечасовага выхаду брыгад на паравозы. Такія прычыны, як хвароба брыгад і водпускі, зьяўляюцца штодзенным падарожнікам спаранай язды. Таму падвымённыя брыгады павінны быць прымацаваны ў залежнасьці ад аболугоўваньня цягавых вучасткаў да 2-3 паравозаў і не павінна дапускацца скарыстаньне падвымённых брыгад на паравозах, да якіх яны не прымацаваны.

### Хутчэй ліквідаваць рост няспраўных паравозаў

Агульнае становішча паравознага парку па Гомельскім раёне характарызуецца ў наступных лічбах: у студзені — 28,1 проц. няспраўных паравозаў у адносінах да рабочага парку і 16,3 проц. у адносінах да ўсяго парку. А ў першай дэкадзе сакавіка месяца — 34,5 проц. у адносінах рабочага парку і 26,2 проц. у адносінах да ўсяго парку. Рост няспраўных паравозаў тлумачыцца тым, што паравозныя брыгады зараз прадпрымаюць больш патрабавальнаў да якасьнага становішча паравозаў і праведзеным генэральным аглядам становішча ўсяго паравознага парку. Павялічэньне процанту няспраўных паравозаў носіць часовы характар і, бязумоўна, у бліжэйшы час становішча зьменіцца. Аб гэтым выразна гавораць факты гэраічнай работы ўдарнікаў дэпо, паравозных брыгад і дапамога з боку рабочых прамысловасьці.

### Пагрузачна-разгрузачныя апэрацыі—на ўдарныя тэмпы!

Хаця становішча пагрузачных і разгрузачных апэрацый за студзень і люты месяцы значна палепшылася, тым ня менш яно застаецца яшчэ напружаным. Калі сярэднямесячны лішак неразгружаных вагонаў у студзені складаў 2.043, дык у лютым — 999. У Гомелі і на іншых станцыях праводзіцца кругласутачная работа для зьмяншэньня прастою вагонаў. Трэба адзначыць, што частка прастояў адбываецца па віне клієнтуры.

### Працдысцыпліна ўсе яшчэ слабая

У выніку нядбайных адносін, разгільдзяйства, парушэньня правіл руху, няўважлівых адносін да работы колькасьць здарэньняў усё яшчэ вялікая: у студзені 136 здарэньняў, у лютым — 131, прычым большасьць з іх (138) прыпадае на затрыманьне ў дарозе для нагонкі пары. Партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі не вядуць належнай барацьбы з прычынамі здарэньняў, з канкретнымі вінаватымі.

Становішча працдысцыпліны ізогул зьяўляецца незадавальняючым. Таварыскія суды працуюць надзвычай слаба. На пасасобныя канкрэтныя выпадкі парушэньня працдысцыпліны не заўсёды рэагуюць.

### Падрыхтоўка кадраў—па-за ўвагай мясцовых арганізацый

Зварот былых чыгуначнікаў ідзе надзвычай слаба. Па ўсім раёне па 15 сакавіка вярнулася толькі 148 чал. Рад арганізацый, ня гледзячы на дырэктывы партыі, не адпускаюць з работы былых чыгуначнікаў.

Заданьне па падрыхтоўцы кадраў цалкам ня выканана. На розных курсах па павышэньні кваліфікацыі і перакваліфікацыі займаецца 575 чал., скончылі курсы 292 чал., недаўкамплектаваны курсы на 300 чал. Недаўкамплектаваньне можна вытлумачыць толькі недаацэнкай з боку гаспадарчых, партыйных і прафсаюзных арганізацый справы падрыхтоўкі кадраў.

### Ганебныя лічбы

Разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва праходзіць надзвычай слаба. **На 1 студзеня прымала ўдзел у сацспаборніцтве 4.382 чал., а на 1 сакавіка — 4.771, што складае ў адносінах да агульнага ліку рабочых і служачых раёну каля 58 проц.** Членаў партыі ў сацспаборніцтве прымае ўдзел толькі 84 проц. агульнага ліку.

Калі да паданых лічбаў дадаць, што да гэтаг часу на раёне няма сапраўднага ўліку вынікаў спаборніцтва і ўдарніцтва і выяўленьня лепшых і горшых ударнікаў, то становішча зусім зразумелым, што справа паляпшэньня усёй работы па разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва яшчэ не стаіць у цэнтры ўвагі партыйных і прафсаюзных арганізацый.

### Партыйная і прафсаюзная работа перабудавана толькі арганізацыйна

Створаны цэхавыя ячэйкі, «трыкутнікі» ў цэхах, брыгадах, групах. Арганізаваны «трыкутнікі» на калёсах. Аднак, уся гэта перабудова праведзена толькі арганізацыйна. Што-ж датычыць зьместу работы, дык яна яшчэ ня зьменена. Нізавыя «трыкутнікі» не адчуваюць сябе кіраўнікамі свайго зьвяна, у выніку чаго рад пытаньняў застецца без рэагаваньня.

Рад буйных арганізацый раёнаў (ст. Споўск, Калінкавічы) толькі ў апошнія дні арганізацыйна перабудавалі сваю работу. На станцыях Нова-Беліцы, Рачыца, Карацэвічы, Васілевічы і Жыткавічы адозва яшчэ не знайшла практычнага аллюстраваньня ў рабоце партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый.

Выторчныя нарады яшчэ не перанесьлі сваю работу ў нізавыя зьвенні, а праводзяцца ў агульна-цэхавым маштабе. Трэба зараз-жа перабудаваць усю работу партыйных і прафсаюзных арганізацый над кутом падпарадкаваньня яе асноўным задачам рэканструкцыі транспарту. Нізавыя зьвенні павінны стаць сапраўднымі кіраўнікамі свайго зьвяна, брыгады, групы, своячасова рагуючы на ўсе пытаньні штодзённай работы.

Усё паданае гаворыць аб тым, што побач з дадатнімі момантамі ў рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК ёсьць рад і адмоўных фактаў, якія патрабуюць ад усіх чыгуначных арганізацый сапраўды бальшавіцкай работы. Толькі пры рашучым разгортваньні крытыкі і самакрытыкі, барацьбы з апартунізмам, шырокім разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва, падняцьці працдысцыпліны пы забясьпечым поўнае выкананьне адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК па аздараўленьні транспарту.

ПАЛЯКОЎСКІ.

## Да адказнасьці вінаватых!

**ВІЦЕБСК (Наш кар.). Ня гледзячы на паданыя сыгналы газэты «ЗЬВЯЗДА», да гэтага часу ня зьнішчаны выпадкі парушэньня спаранай язды на ст. ВІЦЕБСК. У справе прымацаваньня брыгад да паравозаў існуе поўная блытаніна. Адміністрацыя дае галавацяпскія загады аб прымацаваньні брыгад да паравозаў і мяняе іх па 10 раз у дзень. З прычыны гэтага большасьць брыгад яшчэ ня ведаюць дакладна, да якога паравоза яны прымацаваны. Нарадчыкі нядбайна адносяцца да сваёй работы, ня ведаюць, якія брыгады прымацаваны да паравозаў і часта перанідваюць брыгады на чужыя паравозы, або выклікаюць тыя брыгады, якія знаходзяцца ў адпачынку. Наогул на вузьле да гэтага часу справа пераходу на спараную язду яшчэ канчаткова не закончана.**

## Безадкладна ліквідаваць „пробку“

**Полацкая партарганізацыя павінна мабілізаваць рабочыя масы і стаць на чале барацьбы за аздараўленьне чыгуначнага вузла**

**ПОЛАЦАК.** (Наш кар.). НА ЧЫГУНАЧНЫМ ВУЗЬЛЕ, ПАЧЫНАЮЧЫ З САКАВІКА МЕСЯЦА, СТВАРЫЛАСЯ «ПРОБКА». ЗАГРАМАДЖЭНЬНЕ ШЛЯХУ ВАГОНАМІ НАБЫЛО ПАГРАЖАЮЧЫЯ РАЗЬМЕРЫ. АСТАЧА НЕАДПРАЎЛЕНЫХ ВАГОНАЎ НА 14 САКАВІКА ДАСЯГАЛА 836.

ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ «ПРОБКІ» СТВОРАН СПЭЦЫЯЛЬНЫ ШТАБ. АРГАНІЗАВАНЫ ШТУРМАВЫЯ БРЫГАДЫ РАБОЧЫХ, ЯКІЯ МАБІЛІЗАВАЛІСЯ НА ЎВЕСЬ ЧАС ЛІКВІДАЦЫІ «ПРОБКІ», АДМОВІЎШЫСЯ АД ВЫХАДНЫХ ДЗЁН. АРГАНІЗАВАНА «СКВОЗНАЯ» БРЫГАДА СЛУЖАЧЫХ, ЯКІЯ КАНТРАЛЮЮЦЬ РАБОТУ ПА ЛІКВІДАЦЫІ «ПРОБКІ» І ДАЮЦЬ ВЕСТКІ Ў ШТАБ АБ НЕДАХОПАХ У ГЭТАЙ РАБОЦЕ.

НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ВЫНІКІ БАРАЦЬБЫ З ЗАГРАМАДЖЭНЬНЕМ ШЛЯХУ ЯШЧЭ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫЯ. **НА 18 САКАВІКА АСТАЧА ВАГОНАЎ ЯШЧЭ СКЛАДАЛА 700.** НЕАВХОДНА МАБІЛІЗАЦЫЯ ЎСІХ СІЛ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ І РАБОЧАГА КАЛІКТЫВУ, КАБ ТЭРМІНОВА ЛІКВІДАВАЦЬ СТВОРАНАЕ ПАГРАЖАЮЧАЕ СТАНОВІШЧА.

***

9 І 10 САКАВІКА НА СТАНЦЫЮ **ПОЛАЦАК** ПРЫБЫЛІ ДВА ВАГОНЫ ЭКСПАРТНАГА ЛЬНУ, ЯКІЯ З-ЗА НЕДАХВАТУ ВАГОНАЎ БЫЛІ ВЫГРУЖАНЫ І ЗАРАЗ ЛЁН ВАЛЯЕЦЦА Ў ПАКГАУЗЕ. 11 САКАВІКА НА ВЕТКЕ **ХЛАДАБУДУ** ВЫЎ ПАГРУЖАНЫ ВАГОН ВІТЫХ ПТУШАК, ЯКІ ПРАСТАЯЎ БЕЗ АДПРАЎКІ НЕКАЛЬКІ ДЗЁН, ВАГОН З ЖЫВЁЛАЙ З ЛЕПЕЛЯ ТАКСАМА ПРАСТАЯЎ ВОЛЬШ СУТАК НЯВЫГРУЖАНЫМ. ТАКІХ ФАКТАЎ НЕРАСПАРАДЧАСЬЦІ МОЖНА ПАДАЦЬ МНОГА. НА ЛІКВІДАЦЫЮ ЎСІХ НЕДАХОПАЎ ЯШЧЭ НЯ ЗЬВЕРНУТА НАЛЕЖНАЯ ЎВАГА.

АН. Ц—І.

## Конкурс за здаровы паравоз

**ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Па Гомельскім чыгуначным раёне абвешчан трохмесячны конкурс на здаровы паравоз. Конкурс праводзіцца на лепшую брыгаду, лепшы дапаможны цэх, лепшага дзяжурнага па дэпо, лепшую паравозную брыгаду, дыспэтчара, дзяжурнага па станцыі, загадчыка манэўраў, тэхнічнага канторшчыка і лепшую брыгаду па складаньні. Вызначаны прэміі: ордэн працоўнага чырвонага сьцягу, пасылка на курорт і дамы адпачынку, нечарговае атрыманьне дэфіцытных тавараў на працягу 3-х месяцаў і інш.**

## Апартуністы выведзены са складу МК цягі

У «Зьвязьдзе» № 78 была зьмешчана заметка **«Правыя апартуністы МК цягі супроць аздараўленьня паравознай гаспадаркі».** Бельбюро ЦК чыгуначнікаў прызнала палітычную ацэнку «Зьвязды» правільнай і прапанавала Жлобінскому райпрафсаюзу прыняць неадкладныя меры да шырокага выкрыцьця перад рабочымі праваапартуністычных «тэорый» членаў МК Шулькоўскага і Сьпірына, вывёўшы іх са складу МК цягі.

У адказ на вылазку правых апартуністаў — агентаў кулацтва — неабходна мабілізаваць чыгуначнікаў вакол задач выкананьня адозвы ЦК і СНК аб аздараўленьні транспарту, шырока разгарнуўшы спаборніцтва і ўдарніцтва.

## РАБКОРЫ ПІШУЦЬ

### Зьнішчыць чаргу

Паміж кіраўніцтвам заводу «Камунар» і Менскай ашчадкасай заключан дагавор, паводле якога каса абавязуецца ў адзін дзень, не адрываючы рабочага ад работы, выплаціць зарплату.

Але ў часы выплаты пэнсіі па працягу трох дзён ля касы стаіць чарга па некалькі гадзін. Невыкананьне дагавору Менскай ашчадкасай адбіваецца на выканальні прамфінпляну заводам. Гэта зусім ня трывожыць тых фармапістаў, якія падпісалі дагавор.

З.

### „Адміністратары“ з копыта

Адміністрацыя **Копыльскай электрастанцыі і прамкамбінату** ня прыняла свячасовых захадаў для таго, каб забясьпечыць станцыю апалам. Станцыя не працуе. Не працуюць на працягу двух месяцаў і абодва млыны з-за адсутнасьці электраэнэргіі.

Такія адносіны да справы работнікаў станцыі і прамкамбінату мяжуюць са шкодніцтвам.

Р—н.

### Выгрузіць лес

Вялікая колькасьць лесу, прызначанага для фанэрнай фабрыкі **«Чырвоны кастрычнік»**, ляжыць у вадзе.

Гэты лес пры веснавой паводцы можа згінуць. **Фабрычныя арганізацыі ня цікавяцца справай выгрузкі бярвеньняў на бераг, а карыстаюцца тымі матар'яламі, якія выгружаны ў мінулую восень. Мазырскае РайРСІ павінна зацікавіцца гэтай справай.**

ВОКА.

### Хаос і безгаспадарчасьць

Фабрыка **«Чырвоны кастрычнік»** не забясьпечана пажарнымі машынамі. У пажарным дэпо хаос і безгаспадарчасьць. Адсутнічаюць рукавы ў кранаў. Бочкі заўсёды без вады. Пажарнікі не зьяўляюцца на дзяжурствы.

Хто прымусіць кіраўнікоў фабрыкі ўрэшце заняцца справай аховы фабрычнай маемасьці ад пажару.

Л. Н.

*Лом—мартэнам*

## Толькі 38,1 проц.

**Пляны збору мэталялому ня выконваюцца**

### Рашуча ўдарыць па недаацэнцы гэтай работы

**Становішча з загатоўкай лому чорных і каляровых мэталяў застаецца катастрафічным.**

**Лютаўскі плян выканан па чорным мэталі на 38,1 проц., каляровым—на 51,2 проц. Першая пляціднёўка сакавіка дала 14,2 проц. пляну.**

**Абвешчаны месячнік па зборы лому па БССР ад 20 лютага да 20 сакавіка і прадягнуты, згодна пастановы СНКБ, ДА 1-га КРАСАВІКА, на старонках друку ў напежнай меры не асьвятляўся. Сур'ёзнасьць становішча ў забясьпечэньні заводаў ломам завострана тэлеграмай сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА ад 24 студзеня 1931 г.**

**Газэта «РАБОЧЫЙ», маючы ў сябе каля 2-х дзесяткаў лістоў і артыкулаў па пытаньні аб зборы лому, ігнаруе асьвятленьне гэтага пытаньня.**

**Газэта «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА» да гэтага часу не асьвятляе на сваіх старонках удзелу камсамольскіх арганізацый у зборы лому.**

**Старшыня Бабруйскага райпрафсавету ГЕРАБКЕР выгнаў прадстаўніка Менскага агенства тав. Жукоўскага, які прышоў да яго па пытаньні рэалізацыі загаду ВСНГБ аб помазагатоўках.**

**Апарат Мэталялому не ўкамплектаваны. Грамадзкія арганізацыі да гэтага часу вельмі слаба выконваюць дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб зборы лому.**

**Трэба палажыць канец агідным адносінам да збору мэталялому.**

КАЛАШНІКАЎ.

### Бяспрытульныя багацьці

Бабруйскі склад Рудмэталягандлю выканаў у лютым заданьне па загатоўцы лому толькі на 25 проц. Ад прадпрыемстваў дагэтуль нічога не вробілі для здачы мэталялому дзяржаве.

На двары машына-булдыўнічага заводу галоў з 10 ляжыць вялікі каток. Рудмэталягандлю ён не аддасьць таму, што ніяк ня могуць устанавіць, хто яго гаспадар.

На мармэляднай фабрыцы «Чырвоны харчавік» і цацельных ляжыць шмат лому і каляровых мэталяў, але са здачай іх ніхто не сьпяшаецца. На былой скрыначнай фабрыцы валяецца бяспрытульны кацёл.

Трэба сказаць, што жакты, клюбы, заўкомы, кварткомы Бабруйску да гэтага часу яшчэ не разварушыліся ў справе збору мэталялому, хаця месячнік па зборы лому ўжо заканчваецца.

МАГІДАЎ.

### Атрымалі па заслугах

Капыльская спажывецкая кааперацыя атрымала плян загатоўкі на асобны квартал па мэталяломе: чорным — 100 цэнтн., каляровым — 20 цэнтн. Гэта заданьне выканала толькі ў разьмеры 2 цэнтн.

На першы квартал 1931 г. капыльская кааперацыя павінна была загатовіць 600 цэнтн. розпага мэталялому і 118 цэнтн. нявыкананага ў асобным квартале, што разам складае 718 цэнтн., а выканана да 28 лютага ўсяго 9 цэнтн.

Справа аб злачынных адносінах да збору мэталялому была перадана пракурору. 27 лютага парсуд Капыльскага раёну прызнаў вінаватым у зрыве пляну загатоўкі мэталялому Ляндрэса — члена праўленьня і асудзіў яго на 1½ гады зьняволеньня, а старшыню праўленьня—на 2 месяцы прымусовай працы.

Гэты прыгавар павінен паслужыць урокам іншым арганізацыям.

ГАЛІНЕЦ.

### „Таргаша“—пад суд

У саўгасе «Нясята» ёсьць шмат лому, машынных частак, трансмісійных валы, шківы, розныя катлы і часткі з чырвонай меді, у чым так адчувае патрэбу наша прамысловасьць.

Па расказах рабочых усё пералічанае ляжыць ужо 10 год.

На просьбу аддаць лом Рудмэталягандлю загадчык адказаў, што па цэнах Мэталялому ён лом не аддасьць, а лепш пастарэецца выкарыстаць яго сам. Калі гэта ня ўдасца, дык таней, чым па 2 руб. 60 кап. за кілёгр., не аддасьць.

У саўгасе «Бацэвічы» справа са здачай лому ня лепшая. На дварэ саўгасу валяецца шкілет дапатопнага лёкамабіля і шмат іншага лому, а саўгас са здачай гэтага лому не сьпяшаецца. Каапэрацыйная крама, якой даручана загатовіць гэты лом, бязьдзейнічае.

Трэба пакончыць раз назаўсёды з такой нядбайнасьцю ў загатоўках мэталялому

СОГАЛ.

### Вузьдзенскае райпо не сьпяшаецца

Збор мэталялому па Вузьдзенскім раёне праходзіць невыстарчальна. Заданьне ў 76 цэнтнэраў выканана на 80 проц. Райпо заданьне ў 350 цэнтнэраў чорных мэталяў і 5 цэнтнэраў каляровых выканала толькі на 5 проц.

У лесправгасе, пад самым носам каапэрацыі, ляжаць каля 300 пудоў лому. Лесправгас некалькі раз зварачаўся да каапэрацыі, каб яна забрала лом, аднак, каапэрацыя не сьпяшаецца.

Калгасы і саўгасы зусім не ахоплены загатоўкай лому. Да гэтага часу вядуцца спрэчкі паміж рознымі арганізацыямі—каму займацца загатоўкай, а справа пакуль што стаіць на месцы.

Г.

## Каштоўнае вынаходзтва т. Шацкага

**Пра пакуты вынаходцы тав. ШАЦКАГА шмат пісалася ў менскіх газэтах — «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» і «РАБОЧЫЙ». Толькі дзякуючы рашучаму ўмяшаньню РСІ, вынаходзтва тав. ШАЦКАГА было вырвана з рук бюракратаў, якія ўсімі спосабамі імкнуліся затармазіць гэту справу.**

**Вынаходзтва тав. Шацкага ўносіць рэвалюцыю ва ўсю смалакураную прамысловасьць. Да гэтага часу смалакураныя заводы ў БССР абсталяваны старымі, так званымі, «польскімі» катламі. Гэтыя катлы даюць вельмі малы процант шкіпінару і смалы. Перавагі катла т. Шацкага заключаюцца ў тым, што пры тыхжа нормах сырцу і меншай колькасьці апалу, кацёл дае на 60 проц. больш шкіпінару і 64 проц. больш смалы, прычым якасьць шкіпінару значна лепшая. Хэмічны аналіз паказаў, што якасьць шкіпінару, здабытага паводле сыстэмы тав. Шацкага, такая высокая, што дае магчымасьць ацэньваць яго на 100 проц. вышэй. Перавага катла тав. Шацкага заключаецца яшчэ ў тым, што замест двух дзён на разгрузку і падрыхтоўку «польскага» катла, рэторта тав. Шацкага працуе бесьперапынна.**

**Далей вынаходзтва тав. Шацкага дае магчымасьць на тым-жа заводзе каксаваць торф, у той час, як звычайна гэта робіцца на іншых заводах і самым прымітыўным мэтадам. Такіх заводаў у БССР ёсьць каля 150. Вынаходзтва тав. Шацкага дае магчымасьць злучыць абодвы віды вытворчасьці.**

**Зараз яшчэ цяжка падлічыць эканомію ад вынаходзтва тав. Шацкага. Толькі па РСФСР праектуецца пабудаваць значную колькасьць заводаў з «польскімі» катламі. Замена гэтых катлоў новымі дасьць вельмі значную эканомію.**

**Але вынаходзтва тав. Шацкага, ня гледзячы на яго каштоўнасьць, спаткала вельмі бюракратычныя адносіны з боку Белдзяржгандлю і Белсампрамсаюзу. А былыя «гаспадарчыкі» з Гомельскага Сампрамсаюзу — МЭРЛІС і МЭРЛІН ужылі нават мэтады шкодніцтва, каб даказаць, што вынаходзтва тав. Шацкага нічога ня варта.**

**21-га сакавіка калегія НК-РСІ азнаёмілася з гэтым пытаньнем. Аб пакутах тав. Шацкага і дзеяньнях шкоднікаў расказаў інспэктар НК-РСІ тав. ЛІЎШЫЦ. Апраўданьні інжынэра Шпунта, які доўга тармазіў ажыцьцяўленьне вынаходзтва тав. Шацкага, толькі пацьвердзілі матар'ялы РСІ.**

**Калегія НК-РСІ прыняла рад канкрэтных прапаноў. Пытаньне аб вынаходзтве перадана на разгляд СНК БССР і НК-РСІ СССР. ПРАКУРАТУРЫ прапанавана ў 10-дзенны тэрмін ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗНАСЬЦІ ўсіх вінаватых у цкаваньні вынаходзтва тав. Шацкага і бюракратычнай цяганіне.**

Р.

## Сыгналы з месц

(АГЛЯД ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ)

### Органы сувязі працуюць па-старынцы

Шматлікія сыгналы друку аб дрэннай рабоце апарату сувязі пакуль што засталіся бяз выпікаў. Кіраўніцтва сувязі дагэтуль яшчэ не адгукнулася набальшавіцку на гэтыя сыгналы і ня прыняло мер для перабудовы апарату сваёй сыстэмы, навароту яе тварам да задач цяперашняга перыяду. Пошта, тэлеграф, тэлефон, радыё — усё яшчэ працуюць па-старынцы. Рэдакцыя штодзенна атрымлівае з месц шмат лістоў, правільней скаргаў, на валавацтва, бюракратызм, цяганіну, якія пануюць у апаратах сувязі.

Зусім надаўна,—піша тав. **Баім,—магілеўская паштовая сетка** была шматпярана: лік лістаноскаў павялічан з 17 да 32. Магілеўскі разьезд саветаў адзначыў агіднае становішча з дастаўкай лістоў, газэт і часопісяў. І вось замест палепшэньня работы пошты, узмацненьня апарату яе, Белкіраўніцтва сувязі прапанавала... скарацыць колькасьць лістаноскаў па Магілеўскім раёне з 32 да 17 (!?)...

**Барысаўская пошта** зрывае падпіску на газэты і часопісі,—паведамляе тав. **Б.** Газэты на вёску дастаўляюцца праз два тыдні. Апарат пошты працуе бяз усякага кантролю.

**У мястэчку Любань** даўно ўжо пабудаваны радыё-вузел. Але абсталяваньне радыё-ўстановак у кватэрах зрываецца. За ўвесь час гора-радыёфікатары ўсталявалі толькі 15 радыё-точак. (т. **Кукрэш**).

Трэба адзначыць, што некаторыя раённыя арганізацыі недаацэньваюць значэньня радыёфікацыі і не аддаюць гэтай справе належнай увагі.

**Мазырскі райпрафсавет**—паведамляе **Т, «РАДЫЁ-АМАТАР»**—даўсім ня цікавіцца пытаньнем радыёфікацыі. На просьбу радыёсавету адпусьціць 200 руб. на радыёвяшчаньне, старшыня райпрафсавету тав. **Зйдэльман** бюракратычна адказаў: «Мы вам сродкаў на дамо».

**Плешчаніцкі РВК** усяліў у памяшканьне радыё-вузла прыватную асобу. Між тым загадчык вузла ня мае кватэры і жыве ў апаратнай. На працягу доўгага часу вялецца пераліска паміж радыёарганізацыямі і РВК, але аноўні ўпарта не паддаецца. Такія адносіны да работы радыё-вузла зусім недапушчальны (тав. **КОМАР**).

Да гэтага часу ў **Межынскім** раёне не арганізаваны штаб праверкі гаспадаркі сувязі. Загадчык райаддзелу сувязі ня раз зварачаўся ў райком КП(б)Б па гэтым пытаньні, але там усё кормяць абяцанкамі. Намесьнік сакратара райкому КП(б)Б адкладзае гэту справу са дня на дзень (**ГЛЯДАЧ**).

### Культасьветная работа на апошнім месцы

Тав. **П. ГАРБАЧЭВІЧ** піша: «У **Юравіцкім** раёне адсутнічае ўсякая культмасавая работа. У вёсках да гэтага часу ня было ні адной пастаяннай хаты-чытальні, ці чырвонага кутку. У самым мястэчку Юравічы ёсьць пардом, але работы там ніякай няма».

У **В.-Аблянскім** сельсавеце культмасавая работа ў заняпадзе, — піша тав. **ВЯРБІЦКІ.** Хата-чытальня ўвесь час на замку. Загадчык хаты-чытальні тав. **КЛІМКОВІЧ** літаральна бязьдзейнічае. Сельсавет не аддае ўвагі пытаньням культмасавай работы.

Тав. **«ЧЫТАЧ»** паведамляе, што бібліятэка сакуру сельтаварыстваў у Менску засталася без памяшканьня. Чытальня закрыта. Кнігі ўсе аддадзены ў адну кутку. Да апошняга часу бібліятэка знаходзілася ў памяшканьні цэнтральнага дому калгасьніка. Але з таго часу, як сюды перабраліся Белкалгасцэнтр і Трактарацэнтр, пакой, у якім яна знаходзілася, забраны апошнімі.


БЕЛДЗЯРЖТЭАТР | Апошні разьвітальны канцэрт заслужанага артыста рэспублікі М. В. БАЧАРАВА | СЁНЬНЯ, 25 сакавіка

пры ўдзеле артыстаў Ленінградзкіх тэатраў м. ЯКОЎ (тэнар) | ЯСІНОЎСКІ (соло на новым вынайдзеным інструмэнце „Фончэла“)

Данцова і Пэрэльман (мастацк. чыт.)

На раяля Д. Крамерова Р. Сыпярскі.

Білеты прадаюцца ў тэатральнай касе з 12—2 і з 4—6 г. і ў касе тэатру з 6 гадз. веч.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ — Зьвыш праграмы: СУДІДЗЕ справа ЦК РСДРП (меншавікоў). Пачат.: 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура“ — Замежны фільм «ПОРЫВ». Зьвыш праграмы: СУДІДЗЕ справа ЦК РСДРП (меншавікоў). Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал“ — Замежны фільм СКРЫПАЧ з ФЛЁРЭНЦЫІ. Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. Каса з 4 г. 30 м.

КІНО „Галэтары“ — Сучасная бытавая драма РАЗВОД у 7 частках. Зьвыш праграмы—хроніка Саюзкіно № 5. Пач. 1 сэансу ў 6 г. Каса—з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр“ — Мастацкі фільм ЗАКОН ГОР драма ў 8 частках. Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня. Каса—з 12 г. дня.

КІНО „Спартак“ — ТАРАС ТРАСІЛА. Трагедыя ў 7 частях. Пач. у 7 г. 45 м., 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫ ЛЕСАТРАМЫСЛОВЫ ІНСТЫТУТ з 25-III—1931 г. переводзіцца з г. Менску на сталую працу у г. ГОМЕЛЬ.

Даводзіцца да ведама ўсіх прадпрыемстваў і ўстаноў БССР, што па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з атрыманьнем абцірачнага матар'яду (веташ, канцы), будаўнічай пакулі і ахлопку ТРЭБА ЗВАРАЧАЦЦА ВЫКЛЮЧНА Ў БЕЛДЗЯРЖСНАБ, якому належыць перадаваць усе заяўкі. Усе даныя раней заяўкі перасланы Белуцілем Белдзяржснабу. Белуціль спыніў усякае задавальненьне заявак прадпрыемстваў на адначасныя вышэй матар'ялы.

БЕЛУЦІЛЬ.

Бюро завочнага навучаньня сэктару прамкадраў ВСНГБ абвяшчае ПРЫЁМ СЛУХАЧОЎ-ЗАВОЧНІКАЎ ў наступныя навучальныя ўстановы:

Хэміка - тэхналёгічны інстытут—Менск па аддзяленьні асноўнай хэміі і грубай керамікі.

Хэм ка-тэхналёгічны тэхнікум—Менск па тарфяным аддзяленьні.

Архітэктурна-будаўнічы тэхнікум.

Правілы прыёму можна атрымаць у вышэйпакаваных навучальных установах і па ўсіх прадпрыемствах і абчэньнях ВСНГ БССР.

Прыём заяў з 1-га красавіка 1931 г.

Бюро завочнага навучаньня сэктару прамкадраў ВСНГ БССР.

МЕН. ГАР. КК КП(б)Б І ЦСПСБ паведамляюць, што 26 сакавіка, у 6 гадзін вечара ў клюбе САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ (рог Энгельса і Камуністычнай) склікаецца

гарадзкі зьлёт заводаў-шэфаў над дзяржапаратам і падшэфных устаноў па пытаньні аб задачах рабочага шэфства і месячніка па шэфстве.

На зьлёт павінны абавязкова зьявіцца сакратары парткалектываў, ячэек, старшыні ФЗМК, шэфствуючыя брыгады, трыкутнікі падшэфных устаноў, рабсельоры, «лёгкія кавалерысты», прадстаўнікі шматтыражак і насьпенгазэт. Таксама на зьлёт запрашаюцца прадстаўнікі ЦКК НК-РСІ, гаркому КП(б)Б, гаркому ЛКСМБ, ЦП саюзаў і ўсіх рэдакцый газэт: «Зьвязда», «Рабочий», «Чырвоная Зьмена», «Савецкая Беларусь» і «Акцябр».

Адказнасьць за свячасовую яўку на зьлёт ускладаецца на сакратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б.

Мен. Гар. КК КП(б)Б і ЦСПСБ.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПРЫЁМ у Сэрацкую школу саўгаснага вучнёўства, АРГАНІЗАВАНУЮ БЕЛКААПСАЮЗАМ

Школа рыхтуе спэцыялістаў для прыгаравых гаспадарак (жывёлаводаў, гародніка ў і садоўнікаў) і мае 3-гадовы тэрмін навучаньня.

У школу пры аюцца: бронь—вучні прыгаравых гаспадарак, дзеці саўгасрабочых, калгасьнікаў і сялянкоў, якія маюць веды за 4-5 груп высокай школы.

Прыматыя ў школу забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй.

Прыём заяў працягваецца да 15 красавіка

Да заяў патрэбны дакумэнты: аб сацыяльным становішчы, аб асьвеце, аб узросьце, аб здароўі і васьведчаная анкета.

Перавага пры прыёме будзе аддавацца кам